ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ВЕРАСНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 182 (27792) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Навука і каханне для дваіх**

**Ёсць жыццёвая пазіцыя? Выкажы!**

**Увага, новы творчы конкурс «ЧЗ»**

*ЛІЧБА ДНЯ*

## Br5 млн 922,4 тыс.

***склала намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў краіны ў студзені — жніўні бягучага года. Сярэдні заробак у жніўні быў роўны Br6 млн 364,5 тыс., ён паменшыўся ў параўнанні з ліпенем на 1,4%, або на Br90,8 тыс. Пра гэта паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Рэальная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені — жніўні гэтага года ў параўнанні са студзенем — жніўнем мінулага павялічылася на 1,3%, у жніўні ў параўнанні з ліпенем зменшылася на 2,2%. У жніўні гэтага года ў прамысловасці сярэдняя заработная плата склала Br6 млн 937,1 тыс., у сельскай і лясной гаспадарцы — Br5 млн 217,9 тыс.***

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 25.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10560,00 | ▲ |
| Еўра | 13580,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 275,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 818,60 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# «ЗВАРОТ ПАРЫ, ЗНІКНЕННЕ ЛЕТА...»

СЁЛЕТНЯЯ ВОСЕНЬ — КАБЕТА НАДЗВЫЧАЙ ЛЕГКАДУМНАЯ І НЕПРАДКАЗАЛЬНАЯ. ТО ПЕСЦІЛА НЕЗВЫЧАЙНЫМ ДЛЯ ВЕРАСНЯ ЦЯПЛОМ, ГРЫМЕЛА НАВАЛЬНІЦАМІ, ТО ДЫХНУЛА Ў ТВАР ПРАНІЗЛІВЫМ МАРОЗНЫМ ВЕТРАМ, АД ЯКОГА ПАХАВАЛІСЯ І ЛЮДЗІ, І КВЕТКІ. АЛЕ СІНОПТЫКІ КАЖУЦЬ, ШТО РЫЖАЯ ПРЫГАЖУНЯ НЕ РАЗ ПАМЯНЯЕ СВАЕ ПАВОДЗІНЫ І ШТО САПРАЎДНАЕ БАБІНА ЛЕТА ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ. ТРЭБА ПРОСТА КРЫХУ ПАЧАКАЦЬ, АХІНАЮЧЫ КЛОПАТАМ І ПЯШЧОТАЙ ПОЗНІЯ КВЕТКІ І ЛЮДЗЕЙ, ШТО ПОБАЧ. КАБ НЕ ЗМЕРЗЛІ Ў РАННІХ ПРЫЦЕМКАХ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ «Прамая лінія»

## НА ЧУЖОГА СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ І САМ НЕ АГІНАЙСЯ

### Дзяржава абавязкова дапаможа, толькі трэба дакладна ведаць свае правы

**Людзі тэлефанавалі, сумняваючыся ў сур'ёзнасці выплат, якія адбываюцца пры нараджэнні дзяцей. З аднаго боку, добра, што нараджаюць у нас не дзеля грошай, а з іншага боку, шкада, што народ слаба ведае свае правы. Падчас прамой тэлефоннай лініі ў рэдакцыі «Звязды» першы намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Уладзімір ЖАМЧУЖНІКАЎ і начальнік аддзела сацыяльнага страхавання Аксана ШУШКЕТ дапамаглі нашым чытачам запоўніць асноўныя «прабелы».**

СТАР. 3

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

■ Хто, калі не мы?

## У НАС НЯМА ЗАПАСНОЙ ПЛАНЕТЫ

### БЕЛАРУСЬ ЗАКЛІКАЕ ЎРАДЫ ЎСІХ КРАІН СВЕТУ ПРЫНЯЦЬ НА СЯБЕ ДОБРААХВОТНЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

**Каля 120 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў прынялі ўдзел у саміце па клімаце, які прайшоў у штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Форум праводзіўся па ініцыятыве генеральнага сакратара Пан Гі Муна. Мэта мерапрыемства — звярнуць увагу на змены клімату і распрацоўку новага кліматычнага пагаднення, якое заменіць Кіёцкі пратакол і павінна быць гатова да падпісання на сустрэчы ў Парыжы ў канцы 2015 года. У саміце ўзяла ўдзел і беларуская дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ.**

СТАР. 2

Фота Васіля ЗЯНЬКО.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА НА МІЛЬЁНЫ

**Аляксандр Лукашэнка ўчора прыбыў у Малдову з двухдзённым афіцыйным візітам.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы правёў перагаворы ў вузкім і пашыраным складзе з Прэзідэнтам Малдовы Мікалаем Цімофці. Акрамя таго, запланаваны сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Малдовы, старшынёй парламента і лідарамі парламенцкіх фракцый, а таксама з былым кіраўніцтвам гэтай краіны, паведамляе БЕЛТА.

Тым часам у Кішынёве адбыўся беларуска-малдаўскі бізнес-форум, падчас якога прадпрыемствы дзвюх краін заключылі кантракты на $20 млн. Падчас сустрэчы са сваім малдаўскім калегам у пашыраным складзе беларускі лідар выказаў задаволенасць вынікамі бізнес-форуму.

У прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін быў падпісаны пакет дакументаў, якія пашыраюць двухбаковае супрацоўніцтва. Лідары Беларусі і Малдовы выказалі ўпэўненасць, што цяперашні візіт Аляксандра Лукашэнкі стане чарговым крокам у развіцці палітычнага дыялогу, гандлёва-эканамічных і міжрэгіянальных адносін, будзе садзейнічаць далейшаму паглыбленню і ўмацаванню дружбы і супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі.


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**
**по продаже права заключения договора аренды помещений транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги»**

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | Право заключения договора аренды отдельных помещений общей площадью 83,0 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, телефонизация) на 1-м этаже одноэтажного здания пригородного вокзала (инв. № 100/С-46219) по ул. Кижеватова в г. Бресте |
| Балансодержатель | Вокзал станции Брест-Центральный транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| Начальная цена продажи (руб.) | **6 184 770** |
| Сумма задатка (руб.) | 618 000 |
| Срок аренды | 5 лет |
| Ставка арендной платы | 24 739 019 рублей (242,54 базовой арендной величины) |
| Условия оплаты | Разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 15 000 000 |
| Условия продажи | - для оказания услуг общественного питания и розничной торговли;<br>- аренда оборудования в количестве 4 единиц и инвентаря в количестве 21 номенклатурной позиции (сумма арендной платы в месяц – 2 937 305 руб.);<br>- запрет на продажу алкоголя с 22 часов 00 минут до 8 часов 00 минут |
| Организатор аукционных торгов | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**
Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:
1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:
легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем:
копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.
При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:
представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.
**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.**
Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.
Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 28 октября 2014 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются**
**с 8.30 25.09.2014 г. до 17.30 22.10.2014 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.)**
**по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**



**Экономическим судом г. Минска 22.09.2014 г. вынесено определение по делу №391-16Б/2014 о защите требования в собрании кредиторов ООО «Солар Систем» (УНП 190791100).** Общее собрание кредиторов ООО «Солар Систем» по защите требования ООО «Сулона» в размере 2.279.029.671 белорусский рубль состоится **06.10.2014 г. в 10.30** в помещении экономического суда г. Минска по адресу: г. Минск, ул. Академическая, д. 15, корп. 1, каб. 203. УНП 190791100


■ Дамовіліся

# ПАВОЛІ ЕДЗЕШ — ДАЛЁКА СТАНЕШ

## Палітыка «невялікіх крокаў» можа прывесці да буйных вынікаў

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч лічыць паспяховым першы беларуска-амерыканскі інвестыцыйны форум, які прайшоў у Нью-Ёрку. «Мэты, якія мы ставілі, дасягнуты. Ёсць цэлы шэраг канкрэтных праектаў», — сказаў кіраўнік урада.**

### САНКЦЫІ ТОЛЬКІ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ

Высокую цікавасць да інвестфоруму праявілі як прадстаўнікі дзелавых колаў ЗША, так і адпаведных дзяржаўных структур. «Дастаткова сказаць, што практычна на ўсіх мерапрыемствах прысутнічалі прадстаўнікі Дзярждэпартамента ЗША, якія ў пэўнай ступені давалі зразумець бізнесу, што з Беларуссю трэба працаваць і праца гэтая будзе выбудоўвацца планамерна і шматпланава», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, частка прадстаўленых на форуме кампаній імкнулася вырашыць задачы, якія спрыялі б больш паспяховай рэалізацыі праектаў, над якімі яны ўжо працуюць; многія задавалі пытанні, звязаныя з перспектывай развіцця. «І ў гэтым плане мы, вядома, канцэнтравалі ўвагу на неабходнасці пашырэння дагаворна-прававой базы. Мы адназначна казалі аб неабходнасці зняцця санкцый з шэрагу беларускіх прадпрыемстваў, паколькі яны ў тым ліку ўплываюць на простых людзей у працоўных калектывах», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. «Як мне ўяўляецца, разуменне ёсць. Вядома, гэта будзе палітыка, як яны выказаліся, невялікіх крокаў. Але гэтыя крокі ў кірунку таго, каб палепшыць клімат, у першую чаргу гандлёва-эканамічны», — лічыць беларускі прэм'ер.

Увогуле, Міхаіл Мясніковіч бачыць, што ідзе трансфармацыя ўспрымання нашай краіны ў ЗША. У прыватнасці, была адзначана актыўная роля Беларусі ў пытанні ўрэгулявання канфлікту ва Украіне. «Разумная палітыка, як назваў яе Пан Гі Мун, якая праводзіцца Прэзідэнтам Беларусі, прымушае многіх палітыкаў, якія, можа, дастаткова рэзка ставіліся да нашай краіны, па-іншаму паглядзець на тое, што робіцца ў Беларусі, і на яе ролю ў шматлікіх пытаннях», — сказаў прэм'ер-міністр.

### НОВАЯ ПРАГРАМА З МВФ І ВЫТВОРЧАСЦЬ ЛЕГКАВУШАК

«Ужо ў кастрычніку ў Беларусі будзе працаваць місія МВФ. Нашы спецыялісты будуць сустракацца з персаналам фонду для таго, каб выходзіць на выніковы дакумент, канчатковая мэта якога — гэта новая праграма МВФ для Беларусі», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч. Дарэчы, беларускі бок не ставіць на першае месца пытанне выдзялення якіх-небудзь фінансавых сродкаў, хаця гэта таксама актуальна. «Праца з фондам нам у пэўнай ступені патрэбна як пазітыўны сігнал для прыватных інвестараў, якія маглі б актыўна працаваць у Беларусі».

Акрамя таго, беларуская дэлегацыя ўзгадніла з кампаніяй «Джэнерал Мотарс» асноўныя падыходы да стварэння ў Беларусі вытворчых магутнасцяў па вырабе легкавых аўтамабіляў. «Мы дамовіліся аб этапнасці стварэння гэтых магутнасцяў, каб у адпаведнасці з дамоўленасцямі ў рамках Мытнага саюза і ЕАЭС выйсці на ўзровень лакалізацыі да 1 студзеня 2017 года не ніжэй за 30%, да 1 ліпеня 2018-га — 50% і больш. Для гэтага, акрамя буйнавузлавой зборкі, гаворка ідзе аб стварэнні вытворчых магутнасцяў па зварцы і афарбоўцы кузаваў», — заявіў Міхаіл Мясніковіч.

# У НАС НЯМА ЗАПАСНОЙ ПЛАНЕТЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Напярэдадні форуму Пан Гі Мун заявіў, што «для вырашэння праблемы змены клімату ў чалавецтва няма запаснога плана «Б», гэтак жа, як няма запаснай планеты «Б». Калі мы не прымем меры цяпер, то нам прыйдзецца дорага заплаціць у будучыні». Збольшага краіны свету разумеюць сітуацыю, таму саміт даў шэраг рэальных вынікаў.

Беларусь таксама не застаецца ўбаку. Больш за тое — уносіць свае прапановы і расказвае аб дасягненнях. У прыватнасці, наша дэлегацыя агучыла заклік да заахвочвання прамых інвестыцый у экалагічна адказных дзяржавах.

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што Беларусь выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы па Кіёцкім пратаколе. У прыватнасці, наша краіна скараціла выкіды парніковых газаў у параўнанні з 1990 годам на траціну пры рэальным росце ВУП за гэты перыяд у два разы. У тры разы скарочана энергаёмістасць ВУП. Прэм'ер-міністр адзначыў, што палову тэрыторыі Беларусі займаюць лясы, балоты і азёры, якія бераўліва захоўваюцца.

Кіраўнік урада нагадаў, што ў Беларусі лічаць важнай і вельмі актуальнай ініцыятыву генеральнага сакратара ААН «Устойлівая энергетыка для ўсіх». «Інтэграцыя гэтых пытанняў можа быць забяспечана шляхам фарміравання комплекснага энергетычнага парадку ААН у інтарэсах устойлівага развіцця. Заклікаем урады ўсіх краін свету прыняць на сябе добраахвотныя, вялікія, але рэальныя абавязацельствы. Нам усім трэба прыйсці з імі да падпісання новага кліматычнага пагаднення, і Беларусь гатова зрабіць гэта на выкладзеных прынцыпах», — падсумаваў Міхаіл Мясніковіч.

Па выніках кліматычнага саміта была прынята Нью-Ёркская дэкларацыя па лясах. Удзельнікі форуму паабяцалі да 2020 года напалову скараціць страты лясоў і да 2030 года спыніць гэтую тэндэнцыю, у тым ліку з дапамогай лесанасаджэнняў. Але дэкларацыя не з'яўляецца юрыдычна абавязковым дакументам. На жаль. Аднак генеральны сакратар ААН прыцягнуў увагу да аднаўлення сельскагаспадарчых угоддзяў і лясоў. Ён паведаміў, што фінансавыя карпарацыі паабяцалі вылучыць больш за 200 млрд доларaў на забеспячэнне нізкавугляроднага эканамічнага развіцця да 2050 года.

Яшчэ з адной ініцыятывай выступіла кааліцыя мэраў 200 гарадоў з агульным насельніцтвам 400 млн чалавек. Яны заявілі пра гатоўнасць штогод скарачаць эмісіі парніковых газаў на 12,4-16,4%.

Многія прадстаўнікі дзяржаў абвясцілі аб нацыянальных планах дзеянняў і гатоўнасці працаваць над глабальным пагадненнем па змяненні клімату, якое будзе прынята ў 2015 годзе.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Узаемны інтарэс

# КАРЭЙСКІЯ ІНВЕСТЫЦЫІ ПЛЮС БЕЛАРУСКІ ЭНТУЗІЯЗМ

## Міністр Рэспублікі Карэя адкрыў у Мінску Цэнтр інфармацыйнага доступу

Фота БЕЛТА.

**Гэта адзін з 38 падобных цэнтраў у свеце, адкрыццё якіх з 2002 года адбываецца на сродкі карэйскага бюджэту. Мэта такіх устаноў — стварэнне ўмоў для эфектыўнага выкарыстання ў краінах-партнёрах інфармацыйных тэхналогій, павышэнне граматнасці ў гэтай сферы, пашырэнне супрацоўніцтва паміж краінамі і змяншэнне лічбавага разрыву (абмежавання доступу да сучасных сродкаў камунікацыі) на глабальным узроўні.**

— Гэты цудоўны цэнтр адрозніваецца ад папярэдніх тым, што тут не толькі зроблены акцэнт на абмен інфармацыяй паміж людзьмі і аднабаковую перадачу даных, але і на падтрымку кампаній, якія толькі пачынаюць свой бізнес у сферы інфармацыйных тэхналогій, — заўважыў на цырымоніі адкрыцця цэнтра ў Мінску **міністр навукі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і перспектыўнага планавання Рэспублікі Карэя ЧХВЕ Ян Хі (Choi Yang Hee).** — Стварэнне цэнтра фінансаваў урад Рэспублікі Карэя, але яго адкрыццё было б немагчымым без вялікага энтузіязму з боку Беларусі.

Цэнтр інфармацыйнага доступу размясціўся на першым паверсе будынка адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій (вул. Купрэвіча, 1, корп. 2). Ён ўяўляе сабой шматфункцыянальны комплекс, які складаецца з дзвюх ІТ-лабараторый, канферэнц-залы і зоны для індывідуальнай работы. Карэйскі бок аснасціў цэнтр абсталяваннем і стварыў зону традыцыйнай карэйскай культуры і гісторыі, за якой у будучым плануецца размясціць інтэрнэт-кавярню.

— Гэта шматфункцыянальны цэнтр, дзе будзе праходзіць як навучанне камп'ютарным тэхналогіям, так і зносіны паміж ІТ-арганізацыямі. Гэта будзе пляцоўка ў тым ліку і для прапрацоўкі розных пагадненняў, заключэння кантрактаў, — сказаў журналістам **міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Сяргей ПАПКОЎ.** — Цэнтр будзе таксама месцам зносін беларускіх і карэйскіх кампаній.

Праект стаў магчымым дзякуючы дамоўленасцям і сумеснай рабоце беларускага Парка высокіх тэхналогій і карэйскага Нацыянальнага агенцтва па развіцці інфармацыйнага грамадства (NIA). Адкрыццё цэнтра адбылося амаль адразу пасля завяршэння першага Беларуска-карэйскага бізнес-форуму, у якім удзельнічалі 8 буйных карэйскіх кампаній у сферы высокіх тэхналогій. Акрамя таго, дэлегацыя Рэспублікі Карэя правяла сустрэчы на высокім узроўні ў беларускім урадзе і Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. Паміж Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Беларусі і Міністэрствам навукі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і перспектыўнага планавання Карэі быў падпісаны мемарандум аб узаемапаразуменні. Падобны мемарандум падпісалі таксама Дэпартамент інфарматызацыі нашай краіны і Нацыянальнае агенцтва па развіцці інфармацыйнага грамадства Карэі.

— За апошнія 30 гадоў карэйскі ўрад назапасіў дастаткова вялікі вопыт і навыкі ў сферы інфарматызацыі грамадства. Калі мы злучым нашы ноу-хау і навыкі, якія назапашаны ў гэтай сферы, з вашымі высакаякаснымі чалавечымі рэсурсамі, то забяспечым поспех, — сказаў спадар Чхве Ян Хі. — Думаю, мы зможам пашырыць наша супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Я бачу сёння вельмі станоўчы пачатак. Карэя перадала ўжо ўраду Беларусі свой намер удзельнічаць у працэсе фарміравання дзяржаўнай стратэгіі развіцця інфармацыйнага грамадства ў Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Кампетэнтна

Армен ХАЧАТРАН, пасол Арменіі ў Беларусі:

# «МЫ — НАРОДЫ, ЯКІЯ РАЗУМЕЮЦЬ АДЗІН АДНАГО»

## У ХУТКІМ ЧАСЕ КРАІН — УДЗЕЛЬНІЦ МЫТНАГА САЮЗА СТАНЕ БОЛЬШ



**Дом Арменіі, дзе можна будзе набыць тавары, вырабленыя ў гэтай краіне, з'явіцца ў Мінску. А яшчэ ў хуткім часе гэтая краіна плануе падпісаць дагавор аб далучэнні да Мытнага саюза. Пра гэта і не толькі расказаў падчас сустрэчы з журналістамі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Арменіі ў Беларусі спадар Армен ХАЧАТРАН.**

### Развіццё насуперак блакадзе

Пасля таго, як Арменія атрымала незалежнасць, краіне прыйшлося прайсці праз цяжкасці і выпрабаванні, звязаныя з развалам Савецкага Саюза і складанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй. Аднак яна змагла пераадолець гэта і пабудаваць заснаваную на дэмакратычных прынцыпах прававую дзяржаву.

— Пастаўленыя перад нашай дзяржавай мэты і задачы вырашаліся і вырашаюцца ва ўмовах транспартнай блакады Арменіі з боку Азербайджана і Турцыі, — звярнуў увагу пасол. — Нягледзячы на велізарныя цяжкасці, сёння можна ўпэўнена канстатаваць, што Арменія адбылася як краіна з дэмакратычнай формай праўлення, эфектыўным дзяржаўным кіраваннем і рыначнай эканомікай.

Ва ўмовах транспартнай блакады дзяржава пайшла па шляху дывер сіфікацыі сваёй эканомікі, асаблівая ўвага была нададзена сферам эканомікі, найменш залежным ад чыгуначных паставак. Перш за ўсё, гэта фінансавы сектар, інфармацыйныя тэхналогіі, высокія тэхналогіі, турызм, ювелірная справа.

— Пачынаючы з 2000 года, рост валавога ўнутранага прадукту краіны не раз дасягаў 13–14%, — паведаміў дыпламат. — Праўда, улічваючы сусветны фінансавы крызіс, сёлета ў нас чакаецца рост ВУП на 3%.

Па выніках першых сямі месяцаў 2014 года самая вялікая доля ў знешнім гандлёвым абарачэнні Арменіі прыпадае на Еўрапейскі саюз — гэта больш як 29%, на краіны СНД прыпала прыкладна 28%. Найбольш цесныя гандлёвыя сувязі Арменія падтрымлівае з Расіяй, Кітаем, Германіяй, Іранам, ЗША, Турцыяй, Італіяй.

### І Еўропа, і Еўразія

Год таму Арменія заявіла аб сваім рашэнні ўступіць у Мытны саюз і ўдзельнічаць у фарміраванні Еўразійскага эканамічнага саюза. Пасол адзначыў, што гэтае рашэнне сыходзіць з нацыянальных інтарэсаў Арменіі.

— Уступленне Арменіі ў Мытны саюз знаходзіцца на завяршальнай стадыі, — праінфармаваў журналістаў прадстаўнік Арменіі. — Мы спадзяёмся, што ў бліжэйшай будучыні адбудзецца падпісанне гэтага вельмі важнага для нас дагавора.

Разам з тым дыпламат заўважыў, што Арменія працягвае супрацоўнічаць і з еўрапейскімі партнёрамі. За мінулыя гады пры іх падтрымцы ў Арменіі былі праведзены сур'ёзныя інстуцыянальныя рэформы, што дазволіла ёй стаць дзяржавай з больш прадукцыйнай і канкурэнтаздольнай эканомікай. І ў будучыні краіна мае намер працягваць гэтыя рэформы.

Гаворачы пра эканамічныя выгады для Арменіі ад уступлення ў Мытны саюз, пасол паведаміў, што, у першую чаргу, як і іншых краін — удзельніц аб'яднання, яго дзяржаву вабяць неабмежаваныя магчымасці перамяшчэння, бяспошліннага гандлю і, натуральна, велізарны рынак.

— Мы ўсе: і армяне, і беларусы, і расіяне — разумеем, што нашым таварам выйсці на рынак ЕС ці ЗША складана, — дадаў дыпламат. — У той жа час мы — народы, якія разумеюць адзін аднаго, у нас вельмі падобная ментальнасць. Больш за тое, мы ведаем прадукцыю адзін аднаго. Напрыклад, у Арменіі ёсць некалькі магазінаў, дзе прадаюцца выключна беларускія тавары. Адзін — памерам з вялікі супермаркет, там прадаюцца нават трактары! У такіх магазінах прадстаўлены ўвесь спектр беларускіх тавараў, і яны карыстаюцца поспехам.

### Ад ААН да турызму

Згодна са звесткамі армянскай статыстыкі, знешні тавараварот паміж Арменіяй і Беларуссю за перыяд са студзеня па ліпень гэтага года склаў больш за 20 мільёнаў долараў. Наша дзяржава з'яўляецца трэцім па аб'ёме знешняга тавараварота партнёрам Арменіі сярод краін СНД — пасля Расіі і Украіны. У асноўным з Арменіі мы экспартуем каньяк, віно, мінеральныя воды, сухафрукты, прадукцыю сельскай гаспадаркі, медыцынскае абсталяванне і іншае. Экспарт беларускіх тавараў у Арменію за названы перыяд склаў звыш 15 мільёнаў долараў, імпарт армянскіх у нашу краіну — каля 5 мільёнаў. Прыкладаюцца вялікія намаганні для наладжвання супрацоўніцтва ў сферы прамысловай кааперацыі і павелічэння тавараварота.

Стасункі Арменіі з Беларуссю будуюцца як на двухбаковай, так і на шматбаковай аснове. Дзяржавы шчыльна ўзаемадзейнічаюць у рамках ААН і іншых міжнародных арганізацый. І, як заўважае спадар Армен Хачатран, грунтоўна падтрымліваюць адна адну.

Асаблівую ўвагу прадстаўнік Арменіі звярнуў на развіццё турызму.

— Мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб развіваць турыстычнае супрацоўніцтва. У маленькай Арменіі столькі гістарычных помнікаў, столькі помнікаў культуры, што за адзін раз проста немагчыма паглядзець нават асноўныя! Я 57 гадоў жыў у Арменіі і не паспеў дагэтуль убачыць іх усе. Гэтыя помнікі раскіданы па ўсёй тэрыторыі — і ў гарах, і ў цяснінах…

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# НА ЧУЖОГА СПАДЗЯВАЙСЯ...

### ДВАЙНЯТЫ КАЛЯ ХАТЫ

***Алег Кудрыцкі, г. Жодзіна:*** *Аксана Юр'еўна, мяне цікавяць памеры матэрыяльнай дапамогі пры нараджэнні двойні. Гэта сур'ёзныя грошы?*

**Аксана Шушкет:** Калі гэта першыя дзеці ў сям'і, то на аднаго выплачваецца 10 бюджэтаў пражытковага мінімуму, а на другога — 14 БПМ. І калі маці ўстала на спецыялізаваны ўлік у паліклініку да 12 тыдняў ды назіралася там на працягу ўсёй цяжарнасці, то яна дадаткова атрымае яшчэ 1 БПМ.

***А.К.:*** *А калі двойня нарадзілася пасля першага дзіцяці?*

**А.Ш.:** У гэтым выпадку будзе выплачана па 14 «бюджэтаў» на кожнага з нованароджаных. Акрамя таго, напрыклад, у Мінску пры нараджэнні двойні мясцовыя ўлады выплачваюць сям'і дадатковую матэрыяльную дапамогу. Раю вам пацікавіцца ва ўпраўленні сацыяльнай абароны Жодзінскага гарвыканкама на гэты конт. Магчыма, у іх на такі выпадак ёсць свая спецыяльная праграма.

### З ДЗІЦЕМ-ІНВАЛІДАМ — ВЫПЛАТЫ НА ЎСІХ

***Святлана Аляксеева, г. Мінск:*** *Я знаходжуся ў адпачынку па доглядзе дзіцяці. Працуе толькі муж — у бюджэтнай арганізацыі. З пачатку верасня я звольнілася з папярэдняга месца працы. А малому яшчэ няма трох гадоў. Дзе цяпер мне атрымліваць дапамогу і ці павінны мне нешта выплаціць на апошнім месцы працы?*

**А.Ш.:** А якога чысла вы звольніліся з працы?

***С.А.:*** *3 верасня.*

**А.Ш.:** Значыць, дапамогу вам павінны выплаціць за ўвесь верасень па месцы вашай працы. Там жа вам дадуць даведку аб выплаце дапамогі. І ў далейшым ваш муж, калі ў яго арганізацыі працуе больш за 15 чалавек, будзе атрымліваць вашы грошы па сваім месцы працы. Для гэтага ён павінен сабраць усе патрэбныя дакументы і напісаць адпаведную заяву ў камісію па назначэнні дапамог па месцы працы. Разам з тым, адзначу, што калі галава сямейства працуе ў невялікай камерцыйнай арганізацыі (да 15 чалавек), то функцыі па атрыманні такіх дапамог бяруць на сябе тэрытарыяльныя ўпраўленні сацыяльнай абароны па месцы жыхарства.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**• Даведка**

***Бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) з 1 жніўня 2014 года складае 1 млн 343 тысячы 420 рублёў.***

Фота Уладзіслава КУЛЕЦКАГА.

***С.А.:*** *Яшчэ ў мяне пытанне ад сяброўкі, якая жыве ў вёсцы. У яе сям'і трое дзетак старэйшых за тры гады, але ўсе яны непаўналетнія. Адно дзіцё прызнана інвалідам. Дапамога пры гэтым будзе выдавацца на ўсіх дзетак ці толькі на хворую малую?*

**А.Ш.:** Безумоўна, на ўсіх. Калі ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід да 18 гадоў, то яна адносіцца да асобнай катэгорыі. Тут дапамога даецца на ўсіх дзяцей незалежна ад агульнага даходу сям'і. Адзіная ўмова — муж абавязаны афіцыйна працаваць. Прычым калі, скажам, інваліднасць устанавілі сёлета, то бацька летась павінен быў адпрацаваць не менш за 6 месяцаў у каляндарным годзе і працягваць працу цяпер.

***С.А.:*** *А якога памеру будуць выплаты?*

**А.Ш.:** На хворага малога выплачваюць 70% БПМ, а на астатніх — па 50%.

### ВЕДАЦЬ, КАБ ПАСПЕЦЬ

***Уладзімір Жамчужнікаў:*** *Трэба, каб усе ведалі пра свае правы на дапамогі. Бо да абсурднага даходзіла, калі нават бухгалтар, якая абавязана налічваць дапамогі сваім работнікам, не ведала, што можа атрымліваць грошы на дзіця-інваліда, старэйшага за тры гады. Калі гэтая жанчына падлічыла, колькі гадоў яна не атрымлівала ўнушальную дапамогу ад дзяржавы, то нават расплакалася.*

**Кар. «Звязды»:** Цікава. Атрымліваецца, што калі сям'я звярнулася па такую дапамогу не адразу, то за мінулы перыяд грошы яна ўжо не атрымае?

**У.Ж.:** Законам вызначана, што звярнуцца па дапамогу можна на працягу шасці месяцаў пасля ўзнікнення права на яе атрыманне. У гэтым выпадку грошы вам дадуць за ўвесь перыяд. Пасля шасці месяцаў вы будзеце атрымліваць грошы з даты звароту.

### ДРУГОГА ДОЎГА НЕ ЧАКАЛІ

***Вікторыя Лагун, г. Мінск:*** *Я была ў водпуску па доглядзе дзіцяці. З 1 чэрвеня прыпыніла яго і выйшла на працу на поўную стаўку. А з 20 жніўня ў мяне ўжо новы бальнічны ліст па цяжарнасці. У якім памеры мне павінны плаціць дапамогу на першае дзіця?*

**А.Ш.:** За чэрвень вы павінны атрымаць дапамогу ў памеры 100%. З 1 ліпеня па 19 жніўня вам аплацяць 50% дапамогі. А на перыяд адпачынку па цяжарнасці павінны выплаціць зноў у поўным аб'ёме. Калі ваш бальнічны скончыцца, памер дапамогі будзе залежаць ад таго, якое вы прыміце рашэнне — або выйсці на працу, або заставацца ў дэкрэце. У апошнім выпадку на першае і другое дзіця будзе выплачвацца па 100%.

***Кар. «Звязды»:*** *Дарэчы, які памер дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў?*

**А.Ш.:** Памер залежыць ад сярэднямесячнай зарплаты (СЗ) па краіне, якая вызначаецца Нацыянальным статыстычным камітэтам. На першае дзіця — 35% СЗ у месяц. Сёння такі заробак складае 6 млн 33 тысячы рублёў, таму дапамога будзе каля 2 млн 100 тысяч. А на другога і наступных — 40% СЗ. На дзіця-інваліда — 45% СЗ.

### СЯМЕЙНЫ ВЫХАДНЫ

***Іван Сяляўка, г. Клецк:*** *У мяне пытанне наконт «бацькоўскага дня» для шматдзетных сем'яў. Ён даецца толькі маці ці бацьку таксама, калі маці ў дэкрэтным водпуску?*

**А.Ш.:** Сярод дзяцей інвалідаў няма?

***І.С.:*** *Дачцэ нядаўна далі інваліднасць.*

**А.Ш.:** Тады сям'я мае права на адзін свабодны дзень у месяц за кошт Фонду сацабароны, нягледзячы на тое, знаходзіцца маці ў адпачынку па доглядзе дзіцяці або не. А таксама такая сям'я мае права на адзін свабодны дзень у нядзелю за кошт сродкаў наймальніка. Калі дзіця-інваліда няма, то тады ёсць права на «бацькоўскі дзень» 4 разы на месяц за кошт наймальніка па ўзгадненні з ім. А таксама дзецям павінна быць да 16 гадоў, іначай права страчваецца.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Сяргей КУРКАЧ.**

*(Працяг тэмы ў наступным нумары.)*

■ Добрая навіна

## ПРАЧЫТАЦЬ РЭЦЭПТ ДАПАМОЖА «МАШЫНА»

**У Магілёве набылі спецыяльнае прыстасаванне для агучвання друкаванага тэксту для невідушчых.**

— Незвычайны падарунак наведвальнікам абанемента па абслугоўванні інвалідаў па зроку, які знаходзіцца ў філіяле дзіцячай бібліятэкі №2, зрабіла цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк Магілёва, — распавядае **загадчыца бібліятэкі Святлана БУКАЧОВА.** — Трэба толькі пакласці прыбор на тэкст і націснуць кнопку. Прылада яго праскануе і праз навушнікі агучыць.

Скарыстацца прыстасаваннем чытачы могуць толькі ў сценах бібліятэкі. Машына чытае любы друкаваны тэкст, але зусім не разумее рукапісны. Затое ахвотныя могуць прыносіць нават кнігі, каб слухаць іх проста на месцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

**Паважаны Павел Сямёнавіч СВІСТУНОВІЧ, галоўны рэдактар раённай ганцавіцкай газеты «Савецкае Палессе», прыміце ад нас, былых ганцавіцкіх настаўнікаў і вучняў, сардэчныя віншаванні з нагоды дня народзінаў! Зычым Вам усяго самага добрага, творчых планаў і іх здзяйснення! Працягвайце добрыя справы свайго бацькі-звяздоўца.**

**З павагай, Вярбіцкая Л.К., Новік Т.У., Свірыд А.У.**

■ Далучайцеся!

# УСЕ АДЦЕННІ ЖЫЦЦЯ — У АБ'ЕКТЫВЕ

## Рэспубліканскі творчы конкурс «Фота Беларусі» — унікальная магчымасць падзяліцца ўласным светабачаннем

**Калі вы лічыце, што найважнейшым з мастацтваў з'яўляецца фатаграфія, калі вы займаецеся фотатворчасцю на прафесійным або аматарскім узроўні і хочаце, каб вашы работы ўбачылі і ацанілі, — рыхтуйце «пакет дакументаў». Да старту рэспубліканскага фотаконкурсу «Фота Беларусі» засталося ўсяго некалькі дзён: 30 верасня пачынаецца рэгістрацыя конкурсных работ.**

Тэматычны абсяг конкурсу вельмі шырокі, фактычна закранае ўсе сферы нашага жыцця, так што фотамайстры могуць выбраць адну ці некалькі намінацый, у якіх варта паспаборнічаць.

Удалыя здымкі нашых непаўторных пейзажаў, дзікіх жывёл і птушак у натуральным асяроддзі будуць спаборнічаць у намінацыі **«Прырода Беларусі»**. Дзівосная архітэктура роднай зямлі, абрады, якія збераглiся да нашага часу, традыцыйныя святы знойдуць сваё ўвасабленне ў намінацыі **«Гісторыка-культурная і духоўная спадчына Беларусі»**.

Як бачым, прастор для творчасці шырокі. Вашы работы чакаюць з 30 верасня па 28 лютага наступнага года. Дасылайце свае фота на электронны адрас: **PHOTO@TIO.BY**. Агульная колькасць здымкаў не павінна перавышаць 20, у адной намінацыі — пяці.

Астатнія патрабаванні да ўдзельнікаў, у тым ліку і па тэхнічных характарыстыках фота, можна знайсці ў Палажэнні аб конкурсе, змешчаным на нашым сайце **zviazda.by**.

Калі ж героі вашых фотаздымкаў людзі — і тут ёсць прастор для творчасці. У намінацыі **«Чалавек і яго справа»** ўдзельнікі конкурсу мовай фатаграфіі павінны праз людзей расказаць аб дасягненнях нашай краіны ў розных галінах эканомікі і сацыяльнай сферы, а намінацыя **«Партрэт сучасніка»** чакае ілюстрацый да нашага нацыянальнага характару: тут могуць быць і школьнікі, якія захоплена працуюць над заданнем, і маладыя закаханыя, і хлебаробы, і навукоўцы, і ветэраны...

Дзве намінацыі конкурсу разлічаныя на прафесіяналаў сваёй справы. **«Прэс-фота Беларусі»** — конкурс журналісцкай фатаграфіі. Тэматыка і жанравая разнастайнасць — без абмежаванняў. **«Арт-фота Беларусі»** — фатаграфія як мастацтва, дзе асаблівае значэнне мае светлавое, структурнае і графічнае вырашэнне кампазіцыі. У ёй арганізатары конкурсу — а гэта Міністэрства інфармацыі, грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва» і Беларускі саюз журналістаў — спадзяюцца ўбачыць кадры, што адлюстроўваюць дынаміку жыцця, жывыя аб'екты.

У намінацыі **«Фотаапавяданне»** — прастор для аматараў адлюстроўваць сюжэт не на адным, а на некалькіх фота: прымаюцца серыі з 4-5 здымкаў, якія раскрываюць тэму аднаго аб'екта, месца, падзеі або з'явы.

Спецыяльна для юных рупліўцаў фотамастацтва — намінацыя **«Дзіцячы погляд»**. У ёй прымаюцца работы аўтараў да 16 гадоў. Тэма — любая. Адзіная ўмова: удзельнік гэтай намінацыі не можа прадстаўляцца ў іншых. Не абышлі ўвагай і фотааматараў, якія жывуць за межамі нашай краіны: яны могуць паўдзельнічаць у намінацыі **«Беларусь вачыма сяброў»**.

Знайшлося месца і «фотапрыколам» — іх ацэняць у спецыяльнай намінацыі **«Самы гумарыстычны кадр»**, і фота-імправізацыям — для іх намінацыя **«Самы нечаканы (унікальны) кадр»**, і чорна-белым фота (намінацыя **«Лепшы чорна-белы кадр»**).

Акрамя прызоў у намінацыях, па выніках конкурсу будзе ўручаны гран-пры, што прысудзяць фатографу з Беларусі, які прадставіць найбольш арыгінальныя, эмацыянальныя і запамінальныя кадры. Вынікі будуць вядомыя ў маі 2015-га.

■ Наўздагон

# «СЫРНІКІ» ЯК ФЕСТЫВАЛЬНАЯ ВАЛЮТА

## На ручнік, скульптуры, карціны і нават замак з сыру можна было падзівіцца ў Гродне

**Становіцца ўжо традыцыяй, што ў гродзенскім парку імя Жана Эмануэля Жылібера галоўнай «дзеючай асобай» з'яўляецца сыр. Гэта адбываецца падчас фестывалю, які збірае разам яго вытворцаў (сёлета — сыраварaў з Гродна, Шчучына, Навагрудка, Ліды, Ашмян, Любані) і спажыўцоў.**

Напярэдадні ў гродзенскім ААТ «Малочны свет» адбыліся прафесійная дэгустацыя і конкурс якасці сырнай прадукцыі. А ўжо на фестывалі праходзіла дэгустацыя прадукту, але і яго папулярызацыя ў цікавых формах. Дзеці будавалі вежы з брыкецікаў плаўленых сыркоў, рабілі «сырныя» малюнкі. А дарослыя практыкаваліся са штангай, дзе грузамі з'яўляліся дзве 15-кілаграмовыя галавы сыру. Адзін з атлетаў падняў яе ажно 60 разоў. Пераможцы конкурсаў узнагароджваліся фестывальнай грашовай валютай — «сырнікамі». Паводле інфармацыі на банкнотах «дзяржаўнага банка Чыстаўна», яны забяспечваюцца запасам сыру, які потым можна было атрымаць на аўкцыёне.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

народная: людзям прапанавалі пакаштаваць розныя кавалачкі сыру і яны, не ведаючы назваў, вызначалі сваіх «пераможцаў». Як потым аказалася, думкі большасці спажыўцоў супалі з рашэннем прафесійнага журы. У вытворчасці сыру галандскага і расійскага тыпу першынствавала ААТ «Малочны свет», мяккіх і расольных — ААТ «Малочная кампанія «Навагрудскія дары».

Мяркуючы па чэргах, што ўтваралiся да сырных павільёнаў, фестываль для яго ўдзельнікаў — справа не стратная. Да таго ж адбываецца не проста рэклама гэтага прадукту, але і яго папулярызацыя ў цікавых формах. Дзеці будавалі вежы з брыкецікаў плаўленых сыркоў, рабілі «сырныя» малюнкі. А дарослыя практыкаваліся са штангай, дзе грузамі з'яўляліся дзве 15-кілаграмовыя галавы сыру. Адзін з атлетаў падняў яе ажно 60 разоў. Пераможцы конкурсаў узнагароджваліся фестывальнай грашовай валютай — «сырнікамі». Паводле інфармацыі на банкнотах «дзяржаўнага банка Чыстаўна», яны забяспечваюцца запасам сыру, які потым можна было атрымаць на аўкцыёне.

Асабліва ўражвалі «сырныя» шэдэўры ўдзельнікаў конкурсу кулінарнага майстэрства. Вось, напрыклад, якую ідэю ажыццявіла кулінар з Ліды Аксана Палякова:

— Для сваёй работы я выбрала беларускі ручнік як наш нацыянальны абрадавы прадмет. Працавала на працягу трох дзён. Спачатку рабілася аснова, а потым укладваліся ўзоры, наносіўся бляск. Дзякуй спонсару, прадпрыемству «Малочны свет», якое прадаставіла ўдзельнікам конкурсу сваю прадукцыю. Шкада, вядома, што нашы вырабы не вечныя. Але ўсё ж мы паказалі, што сыр можна не толькі есці, але і творча працаваць з ім, рабіць цікавыя рэчы.

На фестывалі была прадстаўлена не толькі прамысловая, але і традыцыйная, так бы мовіць, хатняя прадукцыя. Са сваім сырам, тварагом, маслам, ды яшчэ і пірагамі на фестываль прыехалі жанчыны з вёскі Адэльск Гродзенскага раёна. І не толькі частавалі гасцей, але і праводзілі для іх майстар-клас, прапаноўвалі самім папрактыкавацца ў спрадвечных тэхналогіях.

Дарэчы, у нашых суседзяў, у Літве і Польшчы, даволі распаўсюджаны міні-сыраварні. Яны ствараюцца (як правіла, пры падтрымцы праектаў Еўрасаюза) дзеля развіцця бізнесу ў сельскай мясцовасці. Гэта не канкурэнцыя з буйнымі прадпрыемствамі, а рабочыя месцы ў вёсцы, цікавая прадукцыя, якая вырабляецца не ў прамысловым маштабе, а невялікімі партыямі, у разліку на пэўную катэгорыю спажыўцоў. У гэтым кірунку, мусіць, трэба працаваць і нам, тым больш што айчынныя «сырныя» прылаўкі, у параўнанні з тымі ж літоўскімі і польскімі, пакуль не надта багатыя па асартыменце.

Хаця, як засведчылі фестывальныя павільёны ў Гродне, навінак становіцца ўсё больш. Сёння гэта для нашых вытворцаў вельмі важна ў сувязі з новымі перспектывамі на расійскіх рынках. Зразумела, што попыт на беларускую прадукцыю там, па вядомых прычынах, павялічыўся. Але гэта не азначае, што можна аўтаматычна трапіць са сваім таварам у гандлёвыя сеткі. «Каб там замацавацца,— зазначыў выканаўца абавязкаў дырэктара Ашмянскага сыраробнага завода Станіслаў Раціна,— трэба адпавядаць вельмі сур'ёзным умовам, што прад'яўляюцца да якасці, упакоўкі прадукцыі. Толькі тады можна разлічваць на выгадны экспарт».

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ ЕДЗЕШ — ДАЛЕЙ БУДЗЕШ

## У сталічнай гімназіі №19 з 2010 года дзейнічае дзіцяча-дарослы праект «Перасядзь на ровар»

Школьнікі ў рамках гэтага праекта ўдзельнічаюць у велапрабегах, прапагандуюць здаровы лад жыцця і штогод уносяць сваю лепту ў арганізацыю Дня без аўтамабіля. Гэты год для гімназіі стаў характэрным, паколькі на тэрыторыі адкрылі адразу дзве велапаркоўкі; адна з іх крытая, пры яе ўсталёўцы выкарыстоўваліся тэхналогіі, якія дазваляюць захаваць каранёвую сістэму раслін. Дарэчы, карыстацца гэтымі паркоўкамі змогуць не толькі навучэнцы, але і жыхары горада.

Адкрыццё велапарковак стала сапраўдным святам, апроч адміністрацыі Фрунзенскага раёна і Мінпрыроды, наведала і заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Афінах, 8-разовая чэмпіёнка свету па веласпорце, дырэктар Беларускай федэрацыі веласіпеднага спорту Наталля Цылінская. Вучням малодшых класаў аб карысці перамяшчэння на веласіпедзе распавядалі касцюміраваныя героі Маша і Мядзведзь. Само ўрачыстае адкрыццё паркоўкі выйшла не зусім звычайным: замест разразання стужачкі дырэктар гімназіі Анатоль Мураўёў, кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна Барыс Васільеў і Наталля Цылінская заехалі на паркоўку і пакінулі на ёй ровары.

**Сяргей НІКАНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ЛЕПШЫ РАКУРС ДЛЯ ГАРАДСКОЙ ПТУШКІ

## Калі вы думаеце, што ў горадзе жывуць толькі вароны і галубы, то памыляецеся

**Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» запрашае на першы чэмпіянат Беларусі па фатаграфаванні птушак. Ён пройдзе 5 кастрычніка ў Мінску. Фатаграфаванне птушак з'яўляецца даволі модным захапленнем у многіх краінах свету. А сёлета яно «прапішацца» і ў нас. У адрозненне ад звычайнага назіральніка за птушкамі ў бінокль, задача ўдзельніка чэмпіянату — сфатаграфаваць іх у натуральных умовах.**

— У гэтага чэмпіянату па фатаграфаванні крылатых некалькі мэт: па-першае, мы збіраемся звярнуць увагу людзей на птушак у горадзе. Шмат іх жыве побач з чалавекам, але ён гэтага проста не заўважае, — распавядае **супрацоўнік АПБ па прыродаахоўных пытаннях Сямён ЛЕВЫ**. — Было б добра развіваць цікавасць людзей да фотааніmалістыкі. А такія спаборніцтвы — добрая магчымасць абмяняцца вопытам.

Каб выйграць чэмпіянат, трэба за пэўны час сфатаграфаваць як мага больш розных відаў птушак. Для таго, каб атрымаць максімальную колькасць балаў, трэба не толькі зрабіць здымак, але і вызначыць від птушкі. Удзельнічаць можна як індывідуальна, так і ў камандзе з двух чалавек. Для рэгістрацыі трэба запоўніць заяўку, паслаць яе да 4 кастрычніка на адрас levy@ptushki.org.

Арганізатары падкрэсліваюць, што на чэмпіянат запрашаюцца ўсе аматары фотапалявання. Наяўнасць прафесійнай камеры вітаецца, але не з'яўляецца абавязковай умовай. Можна прыйсці і з мабільным тэлефонам. Галоўнае — сфатаграфаваць птушку не блізка і прыгожа, а так, каб была відаць хаця б адна адметная прыкмета віду.

У плане спаборніцтваў па фатаграфаванні птушак далёка наперад ад нас пайшла Расія. У краіне-суседцы падобныя спаборніцтвы праходзілі ўжо больш за 15 разоў. Там гэта выглядае як ралі: каманда едзе па бездарожжы, шукае птушак. У нас усё будзе ў іншым фармаце: без транспарту і ў горадзе. Прынамсі, такі фармат менавіта першага нацыянальнага чэмпіянату.

Дарэчы, беларускія фотааматары паспелі ўжо заявіць пра сябе на чэмпіянаце ў Расіі. Беларуская каманда заняла першае месца ў расійскім чэмпіянаце ў намінацыі «Палёт жураўля-2013». Так што ёсць на каго раўняцца.

Па выніках будуць вызначаны пераможцы (1, 2, 3 месца) і асобна выбраны лепшы здымак спаборніцтва. Магчыма, журы ўвядзе дадатковыя намінацыі і адзначыць яшчэ некалькі цікавых фота. Пераможцы атрымаюць прызы, а ўсе ўдзельнікі — дыпломы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
25 09 2014 г.

*Час маладых: адкрыты дыялог*

## ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ — ЗАЯВІ!

**Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» аб'явіла старт адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня». Мэта агульнарэспубліканскага праекта — даць магчымасць маладым людзям заявіць пра сваю актыўную жыццёвую пазіцыю і ўмацаваць у грамадскай свядомасці імідж моладзі як актыўнай часткі беларускага грамадства.**

**Тэмы, пытанні, праблемы і прапановы, узнятыя падчас правядзення адкрытага дыялогу, і стануць асновай для вызначэння новага вектара ў рабоце з моладдзю — як з боку грамадскіх фарміраванняў, так і з боку органаў дзяржаўнай улады. На ўсіх этапах адкрыты дыялог будзе праходзіць з выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў, сацыяльных сетак, з прыцягненнем сродкаў масавай інфармацыі — каб запрасіць да дыялогу як мага больш шырокае кола ўдзельнікаў: прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, культуры, навукі, палітыкі, бізнесу, вядомых спартсменаў, маладых людзей, якія дасягнулі высокіх вынікаў у розных сферах дзейнасці і г.д.**

**Інавацыйныя ідэі і крэатыўныя прапановы па актуальных пытаннях маладзёжнай палітыкі стануць асновай пры падрыхтоўцы і правядзенні агульнарэспубліканскага дыялогу. Плануецца, што дыялог «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня» стане адкрытай пляцоўкай як для моладзі Беларусі, так і для міжнароднай супольнасці. Ідэі, канцэпцыі, праграмы, стратэгіі і інавацыі ў сферы маладзёжнай палітыкі будуць акумуляваны для ўнясення прапаноў у рэспубліканскія органы дзяржаўнай улады.**

**«Чырвонка» таксама далучаецца да адкрытага дыялогу і дае слова першаму неабыякаваму прадстаўніку беларускай моладзі.**

# Ці быць міністэрству маладзёжнай палітыкі?

***Яўген КІСЛЫ, выпускнік БДУ, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Свіслацкага раённага выканаўчага камітэта, удзельнік праекта «Разумныя сеткі» (27 гадоў):***

— Дзяржаўная маладзёжная палітка — гэта сад, які прыносіць плады не тым людзям, якія яго закладвалі. Аднак, адмовіўшыся ад «інвестыцый у моладзь», можна застацца без будучыні.

Паняцце «маладзёжная палітыка» надзвычай шырокае: яно ўключае сістэму сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных і прававых захадаў, скіраваных на падтрымку маладых грамадзян, сістэму дзяржаўных прыярытэтаў, скіраваную на паспяховую сацыялізацыю і самарэалізацыю моладзі, на стварэнне ўмоў, якія спрыяюць сацыяльнай актыўнасці моладзі, і многае, многае іншае.

Але хто павінен вырашаць усе гэтыя спецыфічныя задачы? Хто павінен каардынаваць дзяржаўную маладзёжную палітыку? На раённым узроўні яе праблемамі сёння займаецца адна структура — раённы камітэт грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Фактычна на грамадскую арганізацыю ўскладаюцца агульнадзяржаўныя задачы. Аднак трэба мець на ўвазе, што дзейнасць БРСМ распаўсюджваецца не на ўсіх маладых людзей, а толькі на членаў арганізацыі. Да таго ж фінансаванне грамадскага аб'яднання «БРСМ» недастатковае, адчуваюцца цяжкасці з матэрыяльным забеспячэннем яго мерапрыемстваў і акцый. Ёсць і яшчэ адна праблема: раённыя камітэты БРСМ падпарадкоўваюцца толькі свайму абласному кіраўніцтву, а таму канфлікты паміж раённымі камітэтамі маладзёжнай грамадскай арганізацыі і выканаўчай уладай на месцах непазбежныя.

З улікам вышэйсказанага **прапаную стварыць самастойны орган выканаўчай улады пры Савеце Міністраў са статусам юрыдычнай асобы (або міністэрства, або дэпартамент), які будзе адказваць за дзяржаўную маладзёжную палітыку, планаваць, рэалізоўваць яе, а таксама каардынаваць і кантраляваць усе грамадскія маладзёжныя аб'яднанні ў краіне.**

Трэба выпрацаваць дакладную сістэму сацыяльных «ліфтаў» (у спорце, адукацыі і г.д.). Узроставую планку для маладых людзей, мяркую, трэба пасунуць: каб у катэгорыю маладых траплялі людзі ва ўзросце да 35 гадоў. Неабходна распрацаваць празрыстую сістэму крэдытнай дапамогі маладым людзям пры атрыманні вышэйшай і наступнай адукацыі, для будаўніцтва жылля, на спажывецкія патрэбы, пры нараджэнні дзіцяці і г.д. Каб узмацніць прысутнасць маладых людзей у палітычным жыцці грамадства, можна прадугледзець магчымасць прысутнасці моладзі на пасяджэннях міністэрстваў, аблвыканкамаў, Саветаў дэпутатаў, палат парламента.

Маладым людзям, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, трэба даць рэальную магчымасць да вызвалення атрымаць рабочую спецыяльнасць (трактарыста, электрыка, плітачніка, печніка і гэтак далей) з наступнай магчымасцю працаўладкавання. У гэтай катэгорыі маладых людзей пры жаданні павінна быць магчымасць атрымліваць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю.

Можна было б прадумаць механізмы прыцягнення перспектыўнай моладзі з «трэціх краін», прапрацаваць для іх сістэму страхавання, перанавучання, моўныя курсы, паскорыць атрыманне пасведчання на права жыхарства і іншыя захады. Яшчэ адзін важны напрамак — актывізацыя супрацоўніцтва з Еўрасаюзам па ўсіх кірунках дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, у тым ліку і ў рамках Балонскага працэсу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

***P.S.*** *Калі вам ёсць што сказаць, далучайцеся да дыялогу...*

# «Бярозка»: ШТО, ЯК, КАЛІ?

## ЯК?..

***— Як збіраецеся зацікавіць тых, хто не піша сам, але любіць чытаць, прычым, пераважна па-беларуску?***

— Для такіх хлопчыкаў і дзяўчынак у нас таксама распрацаваны цэлыя напрамкі. «Бярозка» збіраецца друкаваць матэрыялы на музычныя, «кіношныя», спартыўныя, псіхалагічныя, навукова-папулярныя і нават кулінарныя тэмы. Апошняя, праўда, не адступаецца ад прынцыпаў літаратурнага выдання: наша «Гатавальня» прапануе рэцэпты страў, што сустракаюцца ў паэмах, раманах, паданнях. Праз увесь нумар парассыпаны кругляшы-«Цікавосткі», апошняя старонка — літаральна «Смешная». Мяркую, што і папулярныя ў вучняў «галаваломкі» ў нас таксама знойдуць сабе месца. Адметнасць іх будзе ў тым, што яны адукоўваюць, а не толькі забаўляюць. Таму што, варта нагадаць, «Бярозка» — не звычайная чарговая друкаваная забаўка, якіх і без яе ў нашых шапіках дастаткова. «Бярозка», як напісана на першай старонцы яе «пілота», — гэта выданне для тых, хто ведае, «што дрэва без каранёў не расце», хоча «рассунуць межы свайго свету» і мае патрэбу «атрымліваць веды, а не інфармацыю». Часопіс дапаможа вырасці ўдзячным і карысным, добрым і, безумоўна, шчаслівым, як кожны самарэалізаваны чалавек.

***— Як, на вашу думку, да часопіса паставяцца бацькі і настаўнікі?***

— Першыя і другія мусяць быць зацікаўленымі, бо, напрыклад, у рубрыцы «Настаўніцкая на праслушцы» ў «пілоце» прадстаўлена размова на тэму трохкутніка «бацькі — вучань — настаўнік». Гэта і сімвалічна, і даволі востра ананосуе саму сутнасць рубрыкі — інтэрактыўны праект з настаўніцкімі краіны, закліканы даць вучням магчымасць пачуць тое, што гаворыцца настаўнікамі за зачыненымі дзвярыма. Гэтая рубрыка можа — пры ўзаемным жаданні падлеткаў і дарослых — стаць месцам канструктыўнага вырашэння самых розных праблем. Што яшчэ гаворыць пра карысць «Бярозкі» не толькі для дзяцей, але і для тых дарослых, якім яны неабыякавыя? Возьмем «Псі-факторыю» — старонкі, на якіх распавядаецца пра тое, як перастаць быць сарамлівым «лузерам» і зарабіць аўтарытэт хутка і назаўсёды; як не баяцца адказваць ля дошкі і рабіць гэта прыгожа; як вывучыць вершы на памяць хутка і без асаблівага напружання... Мы шмат што зможам прапанаваць тым, хто захоча гэта ў сябе ўвабраць.

## КАЛІ?..

***— Калі ж «Бярозка» пачне выходзіць самастойна?***

— З наступнага, 2015, года кожны месяц, на 48-мі каляровых прыгожых старонках пад «сакавітай» вокладкай. Яна, дарэчы, прапануе сваю гісторыю. На «пілоце» адлюстраваны папяровы самалёцік — такія звычайна лётаюць па класе падчас перапынку або нават і на ўроках. Самалёцікам кіруюць пластылінавыя чалавечкі, якім, між іншым, трэба будзе даць імёны. Дык вось, гэтыя чалавечкі... З імі ўвесь час, на кожнай вокладцы нешта адбываецца. Як было б добра, калі б іх прыгоды не засталіся незаўважанымі...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Любоў ВАБІШЧЭВІЧ.**

*Увага, конкурс!*

# «Я — МАЛАДЫ. І МНЕ НЕ ЎСЁ РОЎНА!»

**Па ўжо добрай традыцыі на пачатку новага навучальнага года рэдакцыя «Чырвонкі. Чырвонай змены» разам з Міністэрствам адукацыі абвяшчае чарговы творчы конкурс для юных і маладых няштатных аўтараў! Ён, як і папярэднія, разлічаны найперш на беларускамоўную моладзь, якая збіраецца паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы, каб у далейшым, магчыма, звязаць сваё жыццё з гэтай прафесіяй. Не будзем таіць, што творчая «планка» нашага конкурсу даволі высокая. Малады чалавек, які збіраецца прысвяціць сваё жыццё гэтай цікавай, але нялёгкай сферы, павінен усведамляць: каб стаць журналістам, аднаго толькі жадання мала. Трэба мець дапытлівы розум, вострае вока і лёгкае пяро. І яшчэ — пастаянна працаваць над сабой.**

Наступны год плануецца абвясціць Годам моладзі. Таму адказныя за выпуск «Чырвонкі. Чырвонай змены» вырашылі назваць творчы конкурс **«Я — малады. І мне не ўсё роўна!».** Мы прапануем будучым аўтарам расказаць пра сваю пазіцыю, пра стаўленне равеснікаў да тых ці іншых праблем, якія ўздымаюцца ў грамадстве, у тым ліку найперш у галіне маладзёжнай палітыкі. Да якіх з'яў, сітуацый, пытанняў сёння хлопцы і дзяўчаты ставяцца неабыякава, што прапануюць змяніць? Які іх асабісты ўнёсак у тую ці іншую справу? Не трэба забывацца і пра папярэднія пакаленні, якія ў многім могуць быць прыкладам для сённяшняй моладзі. У чым у іх можна павучыцца, што пераняць? Набліжаецца 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Было б вельмі добра, каб аўтары расказалі, як іх аднагодкі захоўваюць памяць герояў і шануюць ветэранаў.

Традыцыйная просьба: не пішыце матэрыялы агульнымі словамі, не разважайце над тым, што добра вядома. Раскажыце пра канкрэтную падзею, мерапрыемства, якое арганізавала моладзь, каб выказаць сваю неабыякавасць да той ці іншай праблемы ці сітуацыі. Стварылі валанцёрскі атрад? Арганізавалі суботнік? Дапамаглі па гаспадарцы ветэрану? Узялі з прытулку бадзяжную жывёлу? Заступіліся за слабага? Раскажыце пра канкрэтных маладых людзей, якія паказалі такі прыклад. Паверце, іх вельмі шмат! Толькі трэба ўбачыць іх, а лепш — самім далучыцца да такіх неабыякавых, актыўных і поўных энергіі хлопцаў і дзяўчат, каб нешта змяніць да лепшага!..

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Для тых з іх, хто налета збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, рэдакцыя дасць яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Лепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» можа працягваць друкаваць і надалей. Вынікі плануецца падвесці ДА ПАЧАТКУ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ.

Матэрыялы на конкурс можна дасылаць на электронны адрас konkurschz@mail.ru або на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда») з абавязковай пазнакай «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»

Абавязковыя ўмовы, якім павінны адпавядаць конкурсныя работы:

**1.** «Проба пяра» павінна быць ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

**2.** Тэксты дасылаюцца ў фармаце RTF (калі па пошце, дык у раздрукаваным выглядзе і на дыску адначасова).

**3.** Кожная ілюстрацыя ці фотаздымак да тэксту дасылаецца АСОБНЫМ прымацаваным файлам.

**4.** Аб'ём конкурсных работ — не больш за 8 тысяч знакаў (з прабеламі).

**5.** Колькасць «проб пяра» ад аднаго аўтара не абмежавана, аднак пры вялікай колькасці конкурсных работ кожнаму ўдзельніку (пры ўмове належнай якасці матэрыялаў і адпаведнасці ўмовам конкурсу) даецца па адным шанцы. Астатнія яго матэрыялы будуць надрукаваны (зноў жа пры ўмове належнай іх якасці) як звычайныя журналісцкія — па-за конкурсам.

**6.** Узрост удзельнікаў таксама не абмежаваны, але найперш конкурс разлічаны на навучэнцаў старшых класаў.

**7.** Жанр «проб пяра» — любы, але гэта павінна быць толькі проза (нататка, рэпартаж, эсэ, замалёўка, інтэрв'ю).

**8.** Пажадана, каб матэрыял быў напісаны спецыяльна для конкурсу. Вялікая просьба не дасылаць школьных сачыненняў, рэфератаў (і па форме, і па змесце), асабліва падрыхтаваных колькі часу таму. Напачатку тэксту павінен быць загаловак (назва конкурсу не з'яўляецца такім), напрыканцы — імя і прозвішча аўтара.

**9.** Аўтар абавязаны пазначыць свае пашпартныя звесткі (нумар, ідэнтыфікацыйны нумар, кім і калі быў выдадзены дакумент, імя, імя па бацьку, прозвішча) і хатні паштовы адрас (індэкс, населены пункт, вуліца, дом). Гэтыя звесткі патрэбныя для бухгалтэрыі ў выпадку, калі «проба пяра» будзе надрукавана ў газеце. ТОЛЬКІ яны падаюцца аўтарам на БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовах. У выпадку, калі ў маладога ці юнага аўтара яшчэ няма пашпарта, вышэйназваныя звесткі падаюцца на аднаго з бацькоў, настаўніцу, кіраўніка гуртка (звесткі з пасведчання аб нараджэнні для бухгалтэрыі не падыходзяць).

**10.** Апроч таго, аўтар паведамляе СВОЙ нумар мабільнага або хатняга тэлефона, каб рэдакцыя ў выпадку неабходнасці магла аператыўна з ім звязацца.

**11.** Павінна быць пазначаная поўная колькасць гадоў аўтара на момант адпраўлення конкурснай работы, нумар школы і класа.

**12.** Аўтар павінен паведаміць крыху дадатковай інфармацыі пра сябе (10-15 радкоў) у адвольнай форме. Напрыклад, якія і ў чым мае дасягненні (вучоба, спорт, мастацтва і г.д.), чым захапляецца ў вольны час, кім марыць стаць у будучыні і інш.

**13.** Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.

**14.** Пра канчатковую дату падвядзення вынікаў творчага конкурсу рэдакцыя паведаміць дадаткова. Адсочваць публікацыю «проб пяра» павінны самі юныя і маладыя аўтары або іх куратары (бацькі, настаўнікі, кіраўнікі гуртка).

❍ ❍ ❍

Ну што ж, «вастрыце пёры», аўтары! Зычым усім творчых поспехаў і перамог! Як мы заўжды паўтараем, паверце, прайграўшых у конкурсе не будзе!

**Куратары праекта**
**Сяргей РАСОЛЬКА,**
**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Супраць наркотыкаў

# НЕ «ПРАМАРКІРУЙ» ЖЫЦЦЁ

## Ад спайсу няма паратунку

**Чацвёра студэнтаў брэсцкай ВНУ атруціліся курыльнымі сумесямі. У беспрытомным стане іх даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. У Гродне 16-гадовая школьніца збывала асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы. Напіўшыся піва, дзве 16-гадовыя дзяўчыны ўчынілі бойку і абрабавалі незнаёмку. Адна з дэбашырак знаходзіцца на ўліку ва ўрача-нарколага... На жаль, апошнім часам навучэнская моладзь усё часцей трапляе ў крымінальную хроніку.**

— Колькасць злачынстваў, здзейсненых з удзелам непаўналетніх, за 8 месяцаў гэтага года павялічылася на 5% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага. Рост падлеткавай злачыннасці адзначаецца ў Мінскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Перш за ўсё гэта звязана з павелічэннем — амаль у пяць разоў — колькасці падлеткавых злачынстваў у сферы незаконнага абарачэння наркатычных сродкаў, а таксама з алкагалізацыяй моладзі, — тлумачыць **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Віталь ЯНЧЫН**. — Тэндэнцыя абумоўлена распаўсюджанасцю ў маладзёжным асяродку псіхаактыўных рэчываў (аналагаў наркатычных сродкаў), якія змяшчаюцца ў курыльных сумесях і «марках».

Каб высветліць асноўныя прычыны ўцягвання падлеткаў у спажыванне наркатычных сродкаў, упраўленне ўнутраных спраў Гомельскай вобласці разам з абласным упраўленнем адукацыі правяло ананімнае анкетаванне непаўналетніх ва ўзросце 15—17 гадоў — навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі з усіх раёнаў вобласці. Усяго ў апытанні ўзялі ўдзел 14,5 тысячы чалавек. Уплыў кампаніі як галоўную прычыну згадалі 47% рэспандэнтаў. На лішак вольнага часу і гультайства спасліліся 30% маладых людзей. 24,5% апытаных лічаць імідж чалавека, які спажывае наркотыкі, модным. 14% назвалі прычынай распаўсюджанне інфармацыі аб «крутасці» наркотыкаў асобамі, якія іх спажываюць або спажывалі раней. І 20% адзначылі невырашальныя жыццёвыя праблемы або праблемы ў сям'і.

— Існуе навукова пацверджаная мадэль значнасці фактараў, што ўплываюць на фарміраванне асацыяльнай асобы. Згодна з ёю, спажыванне псіхатропных рэчываў стаіць на першым месцы, — расказвае **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Таццяна ЕМЯЛЬЯНЦАВА**. — Па нашых назіраннях, першае спажыванне псіхатропных рэчываў адбываецца ўжо ў сярэднім школьным узросце — гэта 12—14 гадоў. Пераходны ўзрост увогуле вельмі небяспечны: яму ўласцівыя экстрэмальныя паводзіны (калі дзеці «эксперыментуюць»), жаданне «быць як усе», бо не ўсе адважваюцца сказаць «не» сваім сябрам або аднакласнікам.

Апошнім часам на наркарынку краіны назіраецца замена наркотыкаў раслінага паходжання сінтэтычнымі псіхатропнымі рэчывамі, якія выкарыстоўваюцца для вырабу курыльных сумесяў (спайсаў) і «марак». Новыя наркотыкі за кароткі тэрмін сталі папулярнымі ў маладзёжным асяродку.

Ёсць звесткі, што ў некаторых установах адукацыі курыльныя сумесі спажываюць ад 90 да 100 працэнтаў падлеткаў. Супрацоўнікі МУС даволі часта затрымліваюць маладых людзей у стане яўнага ап'янення (няўпэўненая паходка, «шкляныя» вочы), аднак пры медыцынскім аглядзе ні алкаголю, ні якіх-небудзь іншых таксічных рэчываў у крыві не выяўляецца.

Спецыялісты папярэджваюць: ужыванне найноўшых псіхатропных рэчываў вядзе не толькі да доўгага лячэння, але і да страшных наступстваў на ўсё жыццё. Родныя тых, хто паспытаў такія рэчывы, кажуць, што іх блізкія страцілі частку сваёй асобы: яны губляюць памяць, уважлівасць, у іх зніжаюцца разумовыя здольнасці, яны становяцца празмерна раздражняльнымі і схільнымі да суіцыдаў. Карацей кажучы, адбываюцца грубыя парушэнні ў псіхіцы і дэградацыя асобы...

Хтосьці пасля спажывання спайсаў адчувае толькі лёгкае ап'яненне, як пасля ўжывання піва. Іншым становіцца так дрэнна, што дослед са спайсамі яны ўжо не паўтараюць. А тыя, хто працягнуў ужываць курыльныя сумесі, кажуць, што праз нейкі час перастаюць адчуваць той самы кайф — яны проста адключаюцца ад рэчаіснасці і нічога, акрамя спайсаў, іх ужо не цікавіць. Залежнасць развіваецца вельмі імкліва.

— Спайсы даюць эфект перадазіроўкі і развіццё псіхатычнага стану з цяжкім пашкоджаннем галаўнога мозга. Нават разавае іх спажыванне можа прывесці да трагічнага зыходу, — падкрэслівае Таццяна Емяльянцава.

Што да «марак», то спажыўцы, якім пашанцавала застацца ў жывых, ні пра які кайф не гавораць. Людзі проста цалкам перастаюць кантраляваць сябе. А тыя факты, калі некаторыя з іх імкнуцца выйсці з кватэры праз вокны ці пакалечыць сябе, магчыма, тлумачацца вострым кіслародным галаданнем, а магчыма, галюцынацыямі, калі чалавеку здаецца, што за ім хтосьці гоніцца.

**Родныя тых, хто паспытаў такія рэчывы, кажуць, што іх блізкія страцілі частку сваёй асобы: яны губляюць памяць, уважлівасць, у іх зніжаюцца разумовыя здольнасці, яны становяцца празмерна раздражняльнымі і схільнымі да суіцыдаў.**

Па словах медыка, многія бацькі не гатовы сутыкнуцца з праблемай наркотыкаў у сваёй сям'і: яны лічаць за лепшае для сябе «не заўважаць» змен у паводзінах дзяцей, выцясняючы праблему са свядомасці... Але гэта ў корані няправільна.

**Вось прыкладны пералік гэтых змен:**

❍ скрытнасць падлетка, якая суправаджаецца павелічэннем працягласці прагулак; падзенне цікавасці да вучобы або да звыклых захапленняў, прагульванне заняткаў;

❍ павялічваюцца фінансавыя запатрабаванні, і падлетак актыўна шукае шляхі іх задавальнення (з бацькоўскіх кашалькоў знікаюць грошы, а з дому — каштоўныя рэчы);

❍ з'яўляюцца новыя, падазроныя сябры або паводзіны старых прыяцеляў становяцца падазронымі (размовы з імі вядуцца шэптам, незразумелымі фразамі або без сведак);

❍ эмацыянальны стан становіцца нястойлівым, з'яўляюцца беспрычынныя рэзкія змены настрою, успышкі злосці, панікі, агрэсіўнасці, рэзкія і непачцівыя адказы на пытанні дарослых;

❍ невыразная расцягнутая гаворка, запаволеныя рухі, няздольнасць мысліць лагічна, тлумачыць свае ўчынкі і іх прычыны, пагаршэнне памяці і ўвагі, з'яўленне санлівасці днём і бяссонніцы — ноччу.

Адбываюцца змены і ў знешнім вобліку: з'яўляюцца бледнасць, зямлісты колер твару, кругі пад вачамі, якія становяцца чырвонымі ці мутнымі; празмерна шырокія зрэнкі не рэагуюць на святло, адсутнічае міміка або, наадварот, яна ненатуральна «жывая», ёсць сляды ад уколаў (на тыльным боку кісці, лакцявых згібах, на нагах, на скуры галавы, пад валасамі).

Любая з пералічаных прыкмет паасобку наўрад ці можа стапрацэнтна сведчыць пра спажыванне падлеткам наркотыкаў, аднак наяўнасць некалькіх гэтых прыкмет павінна насцярожыць бацькоў ці педагогаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Парады бывалых

Фота Ірыны КАРПЕНКІ.

# ЯК ВЫЖЫЦЬ ПЕРШАКУРСНІКУ? ЧЫТАЦЬ «КНІГІ»!

**Дзе жыць першакурсніку: у інтэрнаце ці на здымнай кватэры? Ці дарагія студэнцкія сталовыя і дзе можна паесці больш танна? Як сумяшчаць вучобу з працай і не быць падобным на «зомбі»? Адказаць на гэтыя і многія іншыя пытанні паспрабавалі валанцёры «Брацтва арганізатараў студэнцкага самакіравання» (БАСС) — іншымі словамі, актывісты і лідары. «Як выжыць першакурсніку?» — менавіта так гучала тэма мерапрыемства. Насамрэч такім пытаннем задаюцца многія з іх. І гэта не дзіўна, бо былым школьнікам, якія пераступілі парог універсітэта, часам цяжка ўладкавацца на новым месцы, складана прывыкнуць да новых нагрузак і новых людзей.**

...Калі я ўвайшла ў офіс БААС, у мяне адразу запыталіся: ці не «кніга» я? Потым адзін са стваральнікаў арганізацыі і эксперт Павел Махінаў мне і іншым патлумачыў:

— Наша мерапрыемства праходзіць у фармаце «Living library» — калі цікавыя людзі-эксперты распавядаюць пра тое, што ведаюць самі, каб дапамагчы першакурснікам адаптавацца ў новых умовах. Усё гэта праходзіць вельмі весела, інтэрактыўна і пазнавальна. Эксперты — гэта «кнігі», а ўдзельнікі садзяцца і «чытаюць» іх: слухаюць гісторыі, задаюць пытанні і такім чынам атрымліваюць патрэбную для сябе інфармацыю. На кожную «кнігу» даецца 15 хвілін. Мне здаецца, што гэтага часу дастаткова, каб зразумець, у чым сутнасць, задаць пытанні, а экспертам навесці студэнтаў на самастойны пошук. Вельмі важна атрымаць той неабходны зарад матывацыі, каб дадаткова нешта даведацца і нешта зрабіць. У гэтым плане, мяркую, наша мерапрыемства павінна вельмі дапамагчы першакурснікам.

Напрыклад, пра асаблівасці кватэрнага пытання распавяла Надзея Варывончык, якая працуе ў агенцтве нерухомасці. Цяпер першакурснікі ведаюць: для таго, каб не застацца падманутым, трэба выбіраць варыянт пошуку жылля з аплатай па факце, калі шукаеш кватэру праз агенцтва, і, безумоўна, — ніякіх перадаплат. Таксама неабходна засведчыць перадачу грошай распіскай і правяраць ключы ад здымнага жылля ў прысутнасці гаспадара ці агента. «Чытачы» даведаліся, што самыя дарагія раёны Мінска ў плане арандаванага жылля — гэта Цэнтральны і Савецкі, а самыя танныя — Заводскі і Партызанскі.

Пра сталоўкі Мінска — дзе знаходзяцца самыя танныя і дзе найбольш смачна кормяць, а куды без пропуска не пройдзеш — расказала Ксенія Тарасевіч, стваральнік гіда па студэнцкіх сталоўках. Наўрад ці вы ведалі, што ў сталовай студэнцкага гарадка БДУ на Першамайскай можна расплачвацца карткай, і ўваход туды магчымы без пропуска. Для таго, каб паесці ў сталовай ліцэя БДУ, пропуск таксама не патрэбны. Вам спатрэбяцца толькі грошы і апетыт, бо гатуюць там вельмі смачна.

А Маргарыта Апановіч, якая часта ўдзельнічае ў розных міжнародных студэнцкіх праектах, падзялілася сваімі ведамі наконт выбару той ці іншай праграмы, нюансамі састаўлення матывацыйнага пісьма, а таксама падрыхтавала для кожнага спіс сайтаў міжнародных праектаў. Сваім вопытам сумяшчэння вучобы і працы, а таксама пошуку падпрацоўкі падзялілася Дыяна Лебедзева. Па яе меркаванні, самы галоўны рэсурс, якім зараз валодаюць студэнты малодшых курсаў, — гэта час. І для таго, каб гэты час не губляць, трэба развівацца, займацца самаадукацыяй.

**Эксперты — гэта «кнігі», а ўдзельнікі садзяцца і «чытаюць» іх: слухаюць гісторыі, задаюць пытанні і такім чынам атрымліваюць патрэбную для сябе інфармацыю.**

У кожным універсітэце ёсць свае органы самакіравання — такія як прафсаюз, студсавет, студсаюз і іншыя. Гэтыя арганізацыі, як распавёў Павел Махінаў, могуць студэнту дапамагчы. Напрыклад, у БДУ праз прафсаюз можна атрымаць абанемент у басейн і трэнажорны зал, а таксама талоны на ежу. Розныя студэнцкія аб'яднанні, якія займаюцца арганізацыяй святочных мерапрыемстваў (Дня першакурсніка і інш.), дазволяць кожнаму праявіць свой талент і ініцыятыву. Пра прававы бок студэнцкага жыцця «чытачы» даведаліся ад Алеся Крата, актывіста маладзёжнай прафсаюзнай групы «Студэнцкая Рада». Гэта сапраўды вельмі важная тэма, бо ведаць свае правы і абавязкі павінен кожны.

Апошнім этапам мерапрыемства стала абмеркаванне таго, што пачулі і зразумелі першакурснікі. Калі «чытачы» дзяліліся эмоцыямі наконт прачытаных імі «кніг», самым папулярным было словазлучэнне «вельмі карысная інфармацыя». І сапраўды, прагучала шмат практычных парад і патрэбнай на старце студэнцкага жыцця інфармацыі.

**Вольга ШЫЛАК,**
**студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Студэнцкае шчасце

# «ДВОЙКА» АТРЫМАЛА «ДЗЯВЯТКУ»

**Напэўна, многія чулі фразу: «Хто не жыў у інтэрнаце — той студэнцкага жыцця не бачыў». Паспрачацца з гэтай думкай, вядома, можна, але ж пагадзіцеся: не ва ўсіх інтэрнатах прысутнічае асаблівая, непаўторная атмасфера — атмасфера студэнцтва, назавём яе так. А вось жыхарам інтэрната №2 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі пашанцавала і з дахам над галавой, і з той самай атмасферай...**

Нядаўна інтэрнат адкрыўся пасля капітальнага рамонту. Ва ўрачыстасцях узялі ўдзел прадстаўнікі рэктарата, Мінгарвыканкама, намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык, будаўнікі і студэнты.

Інтэрнат №2 БДУІР разлічаны на 1225 месцаў. Кожны з 245 блокаў 14-павярховага корпуса мае асобны санвузел і душавую кабіну. Пакоі пераважна двух- і трохмесныя. Чатыры з іх прыстасаваны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Будаўнічыя работы на аб'екце вяліся каля трох гадоў. Гэта нядоўга, улічваючы, што рамонт праводзіўся толькі з частковым адсяленнем студэнтаў. У БДУІР увогуле надаецца шмат увагі такому важнаму пытанню, як забеспячэнне іншагародніх студэнтаў жыллём. Адрамантаваны інтэрнат — істотны ўклад у вырашэнне гэтай праблемы. З яго ўводам у эксплуатацыю паказчык забяспечанасці студэнцкай моладзі месцамі ў інтэрнатах павялічыўся да 70 працэнтаў. Нагадаем, што ў 2010 і 2012 гадах у БДУІР былі адкрыты два новыя інтэрнаты (адзін з іх — у Студэнцкай вёсцы).

**Рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА** ацаніў абноўлены інтэрнат на «дзявятку» па дзесяцібальнай шкале. Вельмі падабаецца новае жыллё і студэнтцы факультэта камп'ютарнага праектавання БДУІР Дар'і Астрэйцы:

— Зараз я вучуся на чацвёртым курсе. Два гады была вымушана здымаць кватэру, а з мінулага года жыву тут. Вельмі задаволена створанымі ўмовамі: цудоўнае абсталяванне, новая мэбля, душ, ванны пакой, выдатная гукаізаляцыя. Праўда, прадугледжана толькі адна кухня на «крыло», але я не назвала б гэта праблемай: чэргаў, каб прыгатаваць сабе ежу, няма. За інтэрнат плачу 120 тысяч рублёў у месяц. І з суседзямі мне пашанцавала.

— Яшчэ не ўсе паспелі засяліцца, таму што ў гэтым інтэрнаце будуць жыць і замежныя студэнты, а яны засяляюцца да лістапада, — патлумачыў **дырэктар студэнцкага гарадка Анатоль ЛУЦКІ.** — Сёння тут жывуць прадстаўнікі ўсіх курсаў: ад першага да пятага... Знайшлося месца і для шасці студэнцкіх сем'яў. Я бачыў, што тут было чатырнаццаць гадоў таму і якім чынам гэтае месца змянялася з цягам часу.

Капітальны рамонт урад узяў пад свой кантроль. Пад канкрэтныя праграмы выдзяляліся грошы: напрыклад, вонкавыя работы (установка шклопакетаў і ўцяпленне) былі зроблены яшчэ ў першы этап рамонту ў пачатку 2000-х гадоў. Потым быў распрацаваны праект, які прайшоў экспертызу. На правядзенне капітальнага рамонту са сродкаў дзяржаўнага бюджэту было выдаткавана каля 40 мільярдаў беларускіх рублёў.

**Вольга ШЫЛАК.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
25 09 2014 г.

РазМЕРКАВАННЕ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ДАЕШ «ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО»!

## або Як малады спецыяліст кіруе жыццём станцыі

**Праца на чыгунцы не з лёгкіх. Рамантыкаў сюды вабіць перастук колаў і бясконцыя палотны рэек, што пранізваюць шырокія абшары. Кагосьці менш летуценнага — магутнасць цягнікоў і саставаў... А дзяжурны па станцыі Калядзічы Вадзім КІЗЯНКОЎ выказваецца аб сваім выбары прафесіі ёміста і лаканічна: «Дзяжурны — гэта сэрца станцыі».**

### УЛАДАР ПУЦЕЙ

— Нам трэба прапусціць па другім галоўным пуці электрацягнік, — седзячы за пультам кіравання станцыяй, — расказвае Вадзім. — Для гэтага неабходна стрэлачныя пераводы 6, 8, 14, 16 устанавіць па прамой, або па «плюсе».

«Плюс» і «мінус» на лексіцы чыгуначнікаў азначаюць становішча стрэлак, якія пераводзяць саставы з аднаго пуці на іншы. Дзяжурны націскае кнопкі на пульце, і перад ім высвечваецца ўвесь маршрут, які пройдзе электрычка.

— Цяпер я бачу, што маршрут пралягае па другім пуці. Значыць, магу адкрыць уваходны зялёны святлафор.

На пульце запальваецца зялёны агеньчык — шлях цягніку адкрыты.

Хлопец працуе па размеркаванні толькі год, але адчувае сябе настолькі ўпэўнена і спакойна (прынамсі, знешне), быццам бы ўсё яго жыццё дагэтуль было звязана з чыгункай.

— У маёй сям'і чыгуначнікаў не было, я першы, — папярэдзіўшы маё пытанне, усміхаецца Вадзім.

**Галоўная задача дзяжурнага — арганізаваць бяспечны рух цягнікоў на станцыі і кіраваць манеўровымі брыгадамі.**

Калі прыйшоў час выбіраць будучую прафесію, спецыяльнасць «Арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту падалася яму найбольш цікавай. Хлопец вырашыў паспрабаваць свае сілы — і пакуль пра свой выбар не пашкадаваў.

— Я працую з многімі людзьмі, сачу за рухам цягнікоў, выконваю манеўровыя работы на станцыі. Праца аператыўная, напружаная, але мне падабаецца.

Сапраўды, зірнуўшы на пульт упраўлення станцыяй, за якім працуе дзяжурны, становіцца крыху страшнавата. Нават чалавек недасведчаны, які бачыць перад сабой толькі мноства лямпачак, пераключальнікаў і абазначэнняў, разумее, што гэты пульт рэгулюе ўвесь рух цягнікоў на ўчастку, таму адказнасць на дзяжурнага кладзецца неймаверная. Галоўная яго задача — арганізаваць бяспечны рух цягнікоў на станцыі і кіраваць манеўровымі брыгадамі (у іх уваходзяць машыніст, памочнік і спецыяліст па фарміраванні цягнікоў).

— Трэба весці мноства журналаў, дзе запісваюцца час прыбыцця і адпраўлення цягнікоў, дыспетчарскія загады. Бываюць і форс-мажорныя сітуацыі, але дзяжурны для таго тут і знаходзіцца, каб хутка іх вырашаць.

Даведацца пра ўзровень зарплаты Вадзіма ў нас так і не атрымалася. Хлопец толькі сціпла адзначыў, што для маладога спецыяліста яна добрая і не вельмі адрозніваецца ад заробку вопытных работнікаў.

На пытанне аб прадаўжэнні працы пасля размеркавання малады чалавек адказвае адназначна: застанецца на чыгунцы. Да таго ж у хлопца ўжо намеціўся кар'ерны рост: на станцыю Сцяпянка малады спецыяліст прыйшоў працаваць аператарам паста цэнтралізацыі, а сюды, на станцыю Калядзічы, ужо дзяжурным. «Не выключана, што калі вы завітаеце да нас праз год, то Вадзім тут ужо працаваць не будзе, бо зойме вышэйшую пасаду», — усміхаецца начальнік станцыі Аляксандр Маскалевіч, адзначаючы высокія прафесійныя здольнасці свайго падначаленага.

### ХАЦЕЎ СТАЦЬ... ТАТАМ

Па словах Вадзіма, «працаваць трэба пастаянна — не пасядзіш і не адпачнеш». Аднак ён адзначае, што графік работы зручны, ёсць шмат вольнага часу: працоўны дзень, два выхадныя і зноў на працу ўначы. Раней малады чалавек у вольны час любіў выбірацца ў кінатэатр, але цяпер на кіно часу ўжо не хапае. Справа ў тым, што, паступіўшы ва ўніверсітэт, хлопец знайшоў сваё каханне — аднакурсніцу, з якой на пятым курсе пабраўся шлюбам. Пасля вучобы маладых людзей размеркавалі працаваць на станцыю Сцяпянка. Пяць месяцаў таму ў іх нарадзілася дачушка. Менавіта з-за гэтай прыемнай акалічнасці ў маладых бацькоў амаль не застаецца вольнага часу. Але Вадзім не засмучаецца. Жартуе, што, паводле слоў яго маці, у дзяцінстве ён хацеў стаць... татам. А яшчэ Вадзім працягвае навучанне — сёлета ў снежні заканчвае магістратуру.

Пакуль год жылі ў Мінску, маладыя спецыялісты атрымлівалі даплату да заробку ў памеры 10 базавых велічынь на здым жылля. Цяпер жа сям'я Кізянковых атрымала жыллё ў інтэрнаце, які знаходзіцца літаральна праз чыгуначныя пуці ад месца працы Вадзіма. Мы не маглі не зазірнуць у госці.

...Згрубненькі свежапафарбаваны будынак. Вадзім праводзіць нас шырокім калідорам і адчыняе дзверы, за якімі бачым апранутую па-дамашняму дзяўчыну з валікам у руках — жонку Вадзіма Наташу. Дарэчы, у яе на чыгунцы працуюць бацькі, так што тут ужо можна казаць пра дынастыю. Невялічкі, пакуль што пусты, але светлы пакой, кухня і санвузел — месца не так шмат, затое яно — сваё. Вось толькі рамонт зрабіць засталося, і можна спраўляць навасэлле.

На пытанне, ці не складана ў такім маладым узросце працаваць, вучыцца і будаваць сям'ю, Вадзім адказвае: «Не складана, бо ў гэтым і ёсць сэнс жыцця». Наталля таксама кажа, што асаблівых цяжкасцяў не адчувае. Праўда, рамонт прыносіць пэўныя нязручнасці:

— Я з Брэсцкай вобласці. Адвезла дачку да бабулі, сама раніцай прыехала сюды, каб дапамагчы Вадзіму, увечары паеду назад, а заўтра, магчыма, зноў прыеду, — распавядае Наталля.

Але на падобныя цяжкасці маладыя глядзяць спакойна і з радасцю і гатоўнасцю «вагон» за «вагонам» фарміруюць «цягнік» свайго сямейнага жыцця.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

*Мінскі раён.*

# НАВУКА І КАХАННЕ ДЛЯ ДВАІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Фактычна Садоўскія кожны свой дзень праводзяць поруч. Сябры ў Ганны і Аляксандра таксама агульныя. Збольшага гэта былыя аднакурснікі.

— З універсітэцкіх часоў я сяброўю з дзяўчынай, якая таксама замужам за сваім аднакурснікам, — распавядае Ганна. — Звычайна мы адпачываем разам. Саша з мужам сяброўкі ідзе, напрыклад, гуляць у футбол, а мы ў гэты час займаемся шопінгам. Потым сустракаемся і адпачываем усе разам.

НАВАТ распавядаючы пра свой адпачынак, маладыя людзі абагульняюць усё адным словам: сумесны. Адпачываюць яны даволі разнастайна: гуляюць па Мінску (апошнім часам сужэнцы нанова адкрылі для сябе Лошыцкі парк), разам глядзяць кіно, чытаюць кнігі. Ганна з задавальненнем глядзіць разам з мужам футбол і хакей. Сям'я нават наведала разам адзін з матчаў чэмпіянату свету па хакеі. І нават хатнія абавязкі Садоўскія паміж сабой стараюцца не дзяліць: Аляксандр заўжды гатовы дапамагчы жонцы, калі тая гатуе ці прыбірае.

З распавяданняў маладых людзей аб сваім жыцці складваецца ўражанне сапраўднай сямейнай ідыліі. Працуюць і адпачываюць разам, цікавяцца адным і тым жа, усе праблемы вырашаюць разам, маюць агульныя планы на будучыню. Нават славутае выпрабаванне на трываласць — сумесную паклейку шпалер — сям'я Садоўскіх перанесла паспяхова.

**Ніякая маленькая спрэчка не павінна ставіць пад пагрозу такую сур'ёзную рэч, як адносіны блізкіх людзей. Магчыма, справа яшчэ і ў тым, што мы маем розныя характары, якія кампенсуюць адно аднаго.**

— Я не магу сказаць, у чым сакрэт такіх адносін, — дзеліцца меркаваннем Аляксандр. — Проста да любых бытавых дробязяў трэба ставіцца адпаведным чынам. Бо ніякая маленькая спрэчка не павінна ставіць пад пагрозу такую сур'ёзную рэч, як адносіны блізкіх людзей. Магчыма, справа яшчэ і ў тым, што мы маем розныя характары, якія кампенсуюць адно аднаго. Ганна вельмі рухавая, энергічная, а я быццам бы яе супрацьлегласць, напэўна, больш спакойны і разважлівы.

— Безумоўна, — смяецца спадарыня Садоўская, — калі я бяру актыўнасцю, то мой муж — розумам. Але тут шмат фактараў, якія трэба ўлічваць. Проста ў нас гэта неяк само сабой атрымліваецца. Мы не сварымся на пустым месцы. Калі казаць пра працу, то дома мы яе не абмяркоўваем і на нашы адносіны яна мала ўплывае. Усе знаёмыя здзіўляюцца: маўляў, як у вас гэта атрымліваецца? Але я не магу даць ім дакладнага адказу.

У Навукова-практычным цэнтры па харчаванні вядуцца самыя розныя распрацоўкі. У асноўным яны маюць практычны характар і могуць адразу перадавацца на вытворчасць. Адным з галоўных практычных вынікаў кандыдацкай працы Ганны была тэхналогія стварэння корму для жывёлы з сумесяў на аснове адходаў піўной вытворчасці. Сярод цікавых распрацовак цэнтра сужэнцы вылучаюць некаторыя з праектаў, што былі прэзентаваны на сёлетняй выставе «БелАгра». Напрыклад, у аддзеле алкагольнай і безалкагольнай прадукцыі змаглі атрымаць першы ў Беларусі кальвадос — знакаміты яблычны брэндзі, што часта ўзгадваўся ў раманах Рэмарка. На ўсё той жа выставе наведвальнікам прапаноўвалі пакаштаваць незвычайны квас — бульбяны. Па словах сужэнцаў, яго смак вельмі адрозніваецца ад прывычнага нам, але большасці «дэгустатараў» ён прыйшоўся даспадобы. Некаторыя людзі прыходзілі на выставу ў іншыя дні спецыяльна, каб яшчэ раз пакаштаваць гэты напой.

Расказваючы пра сваё стаўленне да выбару прафесіі, Аляксандр зазначае, што ні ў якім разе не шкадуе аб тым, што вырашыў займацца навукай. З яго пункта гледжання, менавіта гэтая сфера максімальна падыходзіць як яму, так і Ганне.

**Нават славутае выпрабаванне на трываласць — сумесную паклейку шпалер — сям'я Садоўскіх перанесла паспяхова.**

— Ведаеце, калі ўвесь час задумвацца над сваім выбарам, то хутка знойдуцца нейкія недахопы, якія будуць падавацца вырашальнымі, бо мінусы ёсць у любой прафесіі, — гаворыць Аляксандр. — Асабіста я лічу, што мінусы прафесіі навукоўца можна кампенсаваць. Напрыклад, стэрэатыпны недахоп грошай — праз распрацоўку грантаў і ўдзел у камерцыйных праектах. Праўда, я не думаю, што ў нас непрыстойна малыя заробкі, нам з жонкай на дваіх хапае. Галоўнае, што я знайшоў для сябе ў навуковай працы, — разнастайнасць. Штодзень сутыкаешся з новымі выклікамі, пытаннямі, шукаеш на іх адказы. Гэта не дае «закіснуць». Што вельмі важна — праца навукоўца здольная наталяць прагу ведаў, калі яна ў цябе ёсць. У мяне такая была. Я з дзяцінства чытаў навукова-папулярную літаратуру, любіў глядзець перадачы накшталт «Клуба падарожнікаў». Усё гэта цікавіла, хацелася ведаць, як устроены свет. Думаю, гэта вельмі паўплывала на будучы выбар. Дарэчы, многія факты, пра якія даведваешся на рабоце, знаходзяць прымяненне ў практыцы. У працы навукоўца пераваг столькі, што цяжка ўсё ўзгадаць і пералічыць.

— А яшчэ абавязкова трэба падзякаваць нашым бацькам, якія з дзяцінства выхоўвалі і стымулявалі гэты інтарэс, укладвалі свае сілы і сродкі ў нашу будучыню, — дапаўняе Аляксандра Ганна. — Бо падтрымка дарослых заўжды вельмі важная для дзяцей.

ЗРАЗУМЕЛА, што планы на будучыню ў сям'і Садоўскіх таксама аульныя:

— У першую чаргу гэта, зразумела, дзеці, — кажа Аляксандр, — але з цягам часу прыйдзецца нешта вырашаць і з жыллёвай праблемай. Гэта два галоўныя, глабальныя праекты нашай сям'і. Асабіста мне трэба яшчэ стаць кандыдатам навук (*дарэчы, абарона ў Аляксандра якраз на гэтым тыдні. — **Аўт***.). Наконт працы маё меркаванне такое — калі ты на сваім месцы і робіш усё добра — кар'ерны рост не прымусіць сябе чакаць.

* * *

Шмат хто лічыць, што мужу і жонцы для шчасця трэба часам адпачываць адно ад аднаго. Прыклад Ганны і Аляксандра Садоўскіх карэнным чынам супярэчыць такому ўяўленню — сужэнцы знаходзяцца побач ледзь не кожную хвіліну і не адчуваюць ніякага дыскамфорту. Дык, можа, не ў адпачынках і перапынках справа? Агульная праца, агульны адпачынак і, галоўнае, агульнае каханне. Вось і ўсё, што трэба для шчасця.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

Насустрач марам

# З ПАДАРОЖЖАЎ — ПА ЗВАНОЧКУ



**Як гэта цудоўна, калі мы марым аб чымсьці з самага дзяцінства і з часам дасягаем сваёй мэты! Менавіта так і адбылося ў жыцці Аксаны Данілавай, якая нарадзілася і вырасла ў Баранавічах. Калісьці яна склала спіс сваіх мар, і адной з іх былі падарожжы. За апошні час мара стала рэальнасцю — суразмоўца наведала шмат краін. Колькі гадоў таму яе сям'я пераехала ў Санкт-Пецярбург: мужа запрасілі на пасаду інжынера ў нямецкую кампанію. Як гаворыць сама Аксана, так яны здзейснілі першы крок у невядомае, затое адкрылі для сябе новы свет, новыя магчымасці і перспектывы.**

***— Якое яно — жыццё ў Піцеры? І як вы выбіралі наступныя пункты падарожжаў?***

— Санкт-Пецярбург напачатку мяне і здзіўляў, і бянтэжыў. Гэтыя старыя будынкі з часоў Пушкіна, атмасфера даўніны... Запыленыя вокны і аркі ўнутры двароў... Гэта моцна адрозніваласа ад той атмасферы, у якой вырасла. З цягам часу я адкрыла для сябе мноства прыгожых месцаў — паркаў, вуліц, палацаў і фантанаў. У нейкі момант зразумела, што мне падабаецца жыць у горадзе на Няве... Звычайна мы падарожнічаем удваіх, я і мой муж. Многія пецярбуржцы ездзяць на выхадныя ў Фінляндыю, займаюцца пакупкамі альбо адпачываюць. Вось і мы адважыліся. Спазнаўшы, якая цікавая культура і лад жыцця іншых народаў, нас «панесла» далей — у Аўстрыю. Чаму яна? Радавод па лініі майго бацькі ідзе менавіта адтуль, таму даўно марыла пабываць на радзіме далёкіх продкаў. На наступны год у нас з'явіліся яшчэ больш грандыёзныя планы: Індыя і Амерыка!

***— І вам удалося іх ажыццявіць?***

— Муж неяк выпадкова пазнаёміўся з адным індусам у інтэрнэце. Праз нейкі час той запрасіў нас да сябе ў госці. Нельга было губляць такі шанц, і мы паляцелі! Падчас паездкі зразумелі, што ўсе матэрыяльныя каштоўнасці не такія важныя, як само жыццё. Многія індусы жывуць у нястачы, носяць адну і тую ж вопратку гадамі, ходзяць басанож, працуюць за капейкі, але пры гэтым умеюць радавацца, любіць блізкіх і берагчы тое, што маюць. Мы яшчэ ніколі не атрымлівалі столькі цяпла, любові і клопату з боку зусім чужых нам людзей, а яны

**Нельга было губляць такі шанц, і мы паляцелі! Падчас паездкі зразумелі, што ўсе матэрыяльныя каштоўнасці не такія важныя, як само жыццё.**

аддавалі апошняе, запрашаючы нас да сябе ў госці! І мы імкнуліся быць такімі ж, як яны — простымі і адкрытымі. У публічных месцах вакол нас збіраўся натоўп, каб проста паглядзець на замежнікаў, тым больш што я і мой муж — бландзіны. З іншага боку, нас пастаянна суправаджалі сябры-індусы, бо адным хадзіць небяспечна: рабаванні ў гэтай краіне — даволі распаўсюджаная з'ява.

А потым мы паляцелі ў Амерыку. Хацелася наведаць Лос-Анджэлес, Лас-Вегас, Сан-Францыска, Маямі, Чыкага, Нью-Ёрк... З цягам часу аб'ездзілі гэты кантынент ледзьве не ўздоўж і ўпоперак, агледзелі дзесьці бегла, дзесьці грунтоўна каля дваццаці штатаў. Пазнаёміліся з рознымі людзьмі, убачылі шмат незабыўных месцаў, сюжэтаў і проста атрымлівалі асалоду ад гэтых імгненняў!

***— Якім чынам вы звычайна вандруеце?***

— Заўсёды самастойна, не карыстаючыся паслугамі турыстычных фірмаў. Па прыбыцці ў іншую краіну звычайна бярэм аўтамабіль напракат і падарожнічаем.

***— Ці прывозіце сабе на памяць штосьці адмысловае?***

— Любімыя сувеніры — талеркі з назвай краін, гарадоў, а таксама званочкі.

***— Аксана, што б вы параілі тым, хто марыць аб падарожжах?***

— Па-першае, вучыць англійскую мову. Па-другое, пачынаць падарожжы з бліжэйшых краін — альбо скарыстаўшыся паслугамі турыстычнай кампаніі, альбо самастойна. Па-трэцяе, адкрыць уласны рахунак у банку і аформіць крэдытную картку: у некаторых краінах могуць не прапусціць праз мяжу ды і наогул не выдаць візу, калі ў вас няма банкаўскага рахунку або крэдыткі. І, нарэшце, быць аптымістам: заўсёды можна паехаць туды, дзе не патрабуецца віза і шмат грошай.

**Таццяна ЛАУШ,**
**студэнтка II курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы.**

Выпрабавана на сабе

# У ГРЭЦЫЮ... ПА РОЗУМ,

## або Аўтарытэт даражэйшы за еўра

Набярэжная горада Салонікі і галоўная яе адметнасць — Белая вежа.

**...Неяк мы з сяброўкай выпадкова пачулі, што прыязджаюць прадстаўнікі сонечнай Грэцыі, каб набраць людзей для працы «там». У той перыяд жыцця нам хапала вольнага часу, каб дазволіць сабе хадзіць на такія гутаркі нават не з мэтай кудысьці ўладкавацца, а хутчэй дзеля інтарэсу. У прызначаную гадзіну ў офісе N адбылася выпрабавальная размова з працадаўцамі. І нас запрасілі... ляцець. Меркавалася, што, аказаўшыся на месцы, мы будзем працаваць так званымі «трансферменамі». Гэта людзі, якія сустракаюць турыстаў у аэрапорце. Адтуль гасцей суправаджаюць на аўтобусе да гатэляў, па дарозе знаёмячы іх з прыгажосцю Грэцыі. Пасля праходжання выпрабавальнага тэрміну асабліва здольныя хлопцы і дзяўчаты мелі магчымасць пераквалiфікавацца ў гідаў, што я не прамарудзіла зрабіць. Магчымасць так хутка ўзляцець па «кар'ернай лесвіцы» выпадае не кожны дзень, таму вырашыла рызыкнуць. Тым больш што, здавалася б, напярадзе — цудоўная, цікавая праца. Але...**

### Павышэнне — добрая навіна?

На пачатку працы ў якасці трансфермена ўсё было даволі нядрэнна: стасункі з турыстамі належала падтрымліваць не больш за гадзіну: яны былі стомленыя і, у большасці сваёй, абыякавыя да ўсяго, акрамя магчымасці як мага хутчэй апынуцца ў гасцініцы.

Пасля «павышэння» сітуацыя змянілася. Ніколі не забуду той дзень, калі ўпершыню ўвайшла ў аўтобус у якасці гіда, і ў мяне «ўпіліся» 55 пар вачэй. У іх чыталася: «Што за дзяўчо? А калі прыйдзе наш гід?». І ў гэты момант я адчула, што на аўтарытэтнай пасадзе мне прыйдзецца кожны дзень даказваць, што я не проста «дзяўчына з мікрафонам», а чалавек, за якім «таварышам турыстам» прыйдзецца ісці ў горы, блукаць па незнаёмых гарадах, плаваць па моры. Так ці інакш, калі ты хочаш кіраваць сітуацыяй (а гэта проста неабходна для такой працы), людзі павінны адчуць твой аўтарытэт. Заваёўваць яго даводзілася рознымі спосабамі.

### Валоданне матэрыялам

Добрая экскурсія — гэта, перш-наперш, шмат цікавай інфармацыі. Раней я неаднойчы назірала за працай старэйшых калег. Часам немаладыя ўжо жанчыны і мужчыны з адукацыяй гісторыкаў прапаноўвалі турыстам найсумнейшыя аповеды. Людзі спалі, дзе толькі можна было, размаўлялі паміж сабой і ўсяляк шукалі, чым бы сябе заняць, пакуль ішла экскурсія. Але ніводнага разу ніводзін чалавек не падышоў да гіда і не выказаў прэтэнзій. Складвалася такое ўражанне, што яны ведалі, што едуць на экскурсію толькі за тым, каб лішнюю гадзінку паспаць на заднім сядзенні аўтобуса ці пагуляцца з тэлефонам.

Такія назіранні прывялі мяне да высновы, што валодаць інфармацыяй і зрабіць аповед цікавым — мая першасная задача. Але на практыцы высветлілася, што гэтага не заўсёды дастаткова. Не было ніводнага выпадку, каб, слухаючы мяне, хоць бы адзін чалавек з групы не зрабіў спробы «закідаць» рознага кшталту пытаннямі (не заўсёды датычнымі Грэцыі). Турысты нібы хацелі праверыць, а ці сапраўды я ведаю, пра што распавядаю. Балазе, я ведала.

### Майстэрства добрай арганізацыі

Калі з гісторыяй справы ў нас ішлі добра, дык за дысцыпліну даводзілася змагацца. На працягу экскурсіі вельмі важная менавіта агульная дысцыпліна. Хто-небудзь спазніўся больш чым на дзесяць хвілін — і пачалося: затрымаліся на платнай стаянцы, своечасова не трапілі ў музей (а там ужо другая група), не пачулі званоў аднаго з найпрыгажэйшых храмаў свету і гэтак далей. Сутыкнуўшыся з гэтым аднойчы, я зрабіла выснову, што асабліва непаслухмяным угаворы не дапамагаюць. А неяк пужаць турыстаў я не маю права, таму што, як мы добра ўсе ведаем, «кліент заўсёды мае рацыю». Каб знайсці залатую сярэдзіну, перш-наперш я вырашыла ўважліва азнаёміцца з дакументамі, якія яны падпісваюць перад выездам. Юрыдычна падкаванай, мне больш не прыходзілася ўпрошваць гасцей не спазняцца, эканоміць агульны час і гэтак далей. Некалькі папярэджанняў пра тое, што я ў якасці кіраўніка групы маю права ад'язджаць у прызначаны час, не чакаючы тых, хто спазніўся, не падвялі.

### Бітва з «пантамі»

Хто з нас не бачыў «крутых» амаратаў на кожным кроку расказваць пра свае неабсяжныя магчымасці і дэманстраваць размерна тоўсты кашалёк? Дык вось, сярод адпачывальнікаў такіх «багацеяў» зашмат. Яны чамусьці лічаць астатніх ніжэйшымі за сябе. Падзяліцца з усімі такім сваім пунктам гледжання прасцей за ўсё праз прыніжэнне лідара групы. А на экскурсіі гэта хто? Правільна. Вось і даводзілася акрамя выканання непасрэдных абавязкаў, «не прапускаць удары». Імі магло быць што заўгодна: агідныя фамільярнасці, спробы даць грошай за паслабленне ў дысцыпліне для канкрэтнай асобы і нават... пагрозы фізічнай расправы за маю прынцыповасць! Як правіла, пасля некалькіх «раўндаў» такой узаемнай барацьбы «грашовыя каралі» пераходзілі да дзеянняў. Часцей за ўсё правяралі мае выказванні наконт спазнення. Вынікам такой праверкі станавілася іх «шыкоўная паездка» ў зваротным кірунку на таксі. Па праўдзе кажучы, часам мне даставалася «па шапцы» ад кіраўніцтва. Але перамога над стэрэатыпам «малады — слабы» была таго вартая.

**Людзі спалі, дзе толькі можна было, размаўлялі паміж сабой і ўсяляк шукалі, чым бы сябе заняць, пакуль ішла экскурсія. Але ніводнага разу ніводзін чалавек не падышоў да гіда і не выказаў прэтэнзій.**

### Псіхалагічная дапамога і бюро пазык

Была адна рыса ў сталых калег, якой я зайздросціла: набытая з гадамі абыякавасць. Я ж за два гады так і не пасталела, не навучылася «здымаць локшыну з вушэй». Аматоры «макаронных вырабаў» знаходзіліся ў кожнай групе. Такім людзям было ўсё роўна, куды ехаць. Яны не прагнулі новых уражанняў, цікавых ведаў, прыгожых фотаздымкаў. Яны адпраўляліся на экскурсію з адной мэтай — паразмаўляць. Не мае значэння, калі — у дарозе з суседзямі, у разгар экскурсіі з гідам, на перапынку з кіроўцам. Часам слухаць іх было цікава. Але было шмат і хітруноў. Такія ў лепшым выпадку стараліся заняць лепшыя месцы ў аўтобусе (перыядычна і месца гіда), маніпулюючы слабым здароўем, маленькімі дзецьмі ці яшчэ чым заўгодна. Больш за тое, у мяне пазычаліся грошы на абед дзіцяці (таму што сумка засталася ў гасцініцы), на білет у музей (таму што грошы недзе выпалі з кішэні, а «я прыехаў сюды, толькі каб трапіць у гэты музей»), на сувеніры (бо заўтра мы ўжо ад'язджаем, а купіць іх больш няма дзе). Я добра разумела, што да мяне вернуцца далёка не ўсе грошы. Але калі ў наступны раз прасілі, усё роўна давала. Таму што калі цябе моцна просяць, адказаць немагчыма.

### Адносіны з калегамі

Усіх сваіх турыстаў я так ці інакш любіла: з большасцю было прыемна працаваць, астатнія мяне таму-сяму навучылі. З калегамі сітуацыя была больш цікавая. Іх я проста абагаўляла. Таму што столькі жыццёвага вопыту мне не давялося пачарпнуць больш нідзе.

Старэйшыя калегі ў большасці сваёй ставіліся да моладзі з паразуменнем. Намагаліся дапамагчы, нешта падказаць, навучыць. Да таго моманту, пакуль не прыйшлося размяркоўваць экскурсіі. Здавалася б, працы хопіць на ўсіх. Але, як паказала практыка, за яе яшчэ трэба пазмагацца.

Прафесія экскурсавода мае на ўвазе гатоўнасць днямі (а калі-некалі і ўначы) знаходзіцца ў аўтобусе. Таму для эфектыўнай работы прыходзіцца шчыльна супрацоўнічаць і з кіроўцамі. Гэта даволі лёгка, калі табе не 19 гадоў. У адваротным выпадку саракагадовыя мужчыны лічаць, што самі лепш ведаюць, дзе трэба спыніцца, з якой хуткасцю ехаць і як павінна выглядаць праграма экскурсіі. Для таго, каб даказаць, што ў сваім узросце ты здольная трымаць усё пад кантролем, трэба ўмець пераконваць, стаяць на сваім — і нават перыядычна быць жорсткай.

▼ ▼ ▼

...Вярнуўшыся дамоў, я прывезла куды больш розуму і досведу, чым грошай. Таксама засталіся сябры з розных краін, з якімі даводзілася дзяліць цяжкасці і радасці. Многія з тых, з кім мы спрачаліся больш, чым жартавалі, сёння ў маім спісе самых надзейных таварышаў.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Немагчымае — магчыма*

# МАТЭМАТЫКА — НА 100 БАЛАЎ

**На механіка-матэматычным факультэце БДУ адкрываюцца бясплатныя дыстанцыйныя курсы па падрыхтоўцы абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы. Гэта новы праект, які прайшоў апрабацыю: за час эксперымента было падрыхтавана 12 абітурыентаў, якія здалі ЦТ па матэматыцы на 100 балаў.**

Дыстанцыйныя курсы распрацаваны ў адпаведнасці з аўтарскай методыкай дацэнта кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання механіка-матэматычнага факультэта Аляксея Азарава. Кожны занятак разлічаны на тыдзень: ён уключае прапрацоўку тэарэтычнага матэрыялу і прыкладаў з рашэннямі, а таксама выкананне заданняў двух узроўняў складанасці. Кантраляваць падрыхтоўку вучняў будуць выкладчыкі механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Зносіны, абмен думкамі і кансультацыі будуць адбывацца на форуме.

Дыстанцыйная падрыхтоўка дазволіць выпрацаваць і замацаваць у абітурыентаў навыкі аўтаматычнага рашэння тэставых заданняў з часткі «А» і засвоіць арыгінальныя метады рашэння задач павышанага ўзроўню складанасці з часткі «Б».

Таксама прадугледжана магчымасць на дагаворнай аснове скарыстацца дадатковымі паслугамі па рэцэнзаванні заданняў і індывідуальнымі кансультацыямі выкладчыкаў мехмата БДУ.

Курсы будуць праходзіць па аднагадовай і двухгадовай праграмах, разлічаных адпаведна на адзінаццацікласнікаў і дзесяцікласнікаў. Ахвотныя могуць зарэгістравацца на афіцыйным сайце курсаў www.dl.bsu.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

**Предмет аукциона № 1, в состав которого входят:**

| |
|---|
| Административное здание со складами (2275,6 кв.м) |
| Здание магазина (814,3 кв.м) |
| Здание складов (861 кв.м) |
| Автономная топочная с оборудованием (13,2 кв.м) |
| Водопроводные сети (67.7 м.п.) |
| Электрические сети (687 м.п.) |
| Ограждение, ворота (315.7 м.п.) |
| Котел отопительный на твердом топливе (2009 год ввода) |
| Электрический отопительный котел ЕРСО Р-24 (2008 год ввода) |
| Кран-штабелер ОП-1 (1988 г. выпуска) |
| Кран-штабелер ОП-1 (1988 г. выпуска) |
| Трансформатор (1989 г. выпуска) |
| Аппаратура цифровой проводной системы (2000 г. выпуска) |
| Система ПС (2009 г. выпуска) |
| Защитные роллеты (2009 г.) |
| Торговый киоск (2010 г.) |
| Оргтехника, офисная мебель, инструменты и иное имущество |

Место нахождение предмета аукциона: **г. Гродно, ул. Карского, 33.**

Земельный участок с кадастровым номером 440100000002001047, назначение – участок филиала оптовой торговли.

Стоимость имущества — **14 232 220 365 рублей с НДС.**

Сумма задатка – **1 423 222 037 бел. рублей.**

Сумма шага аукциона составляет **5%** от начальной цены предмета аукциона.

Продавец имущества – **ОАО «Гродноопторг» (230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62, управляющий (029) 6822962).**

Организатор аукциона – **СООО «Глобал Тауэр» (220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131-7, тел. (033) 9028379).**

Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, по каждому из предметов аукциона, на которые регистрируется заявитель, на р/с № 3012127410010 Региональная Дирекция № 400 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гродно, БИК 369, получатель – ОАО «Гродноопторг», УНП 500013881.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором торгов день и время, указанные в извещении о проведении торгов. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в течение 1 (Одного) месяца со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (Пять) процентов.

Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения.

**Аукцион проводится 28 октября 2014 года в 16.00 по адресу: 230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62. Заявления и документы подаются с 20 до 24 октября 2014 года включительно с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Срок окончания подачи заявок – 24.10.2014 г.**

**Телефон для организации осмотра предмет аукциона:**
(044) 566 00 51.
**Телефоны для консультаций и справок:**
(033) 902 83 79, (029) 682 29 62.
**Сайт в интернете: www.opttorg.grodno.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

**Предмет аукциона № 1, в состав которого входят:**

| |
|---|
| Здание закрытого склада № 3 (1383 кв.м) |
| Здание АБК (1736 кв.м) |
| Здание автовесовой (235 кв.м) |
| Здание КПП (8 кв.м) |
| Здание закрытого склада № 2 (749,1 кв.м) |
| Открытая эстакада (6 930 кв.м), контора (38 кв.м) |
| Подъездная ж/дорога (1269,6 м) |
| Весы автомобильные (1994 г.) |
| Котел отопительный (1994 г.) |
| Кран мостовой электрический г/п 16 т (1994 г.) |
| Кран мостовой электрический г/п 20 т(1994 г.) |
| Кран мостовой электрический г/п 20 т(1993 г.) |
| Кран-балка г/п 3,2 т. (1994 г.) |
| Кран-балка г/п 3,2 т. (1994 г.) |
| Кран-балка г/п 5,0 т. (1994 г.) |
| Электротельфер г/п 3,2 т. (1994 г.) |
| Комплект трансформаторной подстанции (2011 г.) |
| Внеплощадочные электросети (1453,7 м) |
| Сети канализации внутриплощадочные (2163,1 м) |
| Телефонные сети внеплощадочные (730 м) |
| Сети водопровода внутриплощадочные (1049 м) |
| Внутриплощадочные электросети (1031 м) |
| Благоустройство и озеленение, ограждение вокруг территории (1064 м) |
| Сети канализации внеплощадочные (487,1 м) |
| Оргтехника, офисная мебель, инструменты и иное имущество |

Место нахождение предмета аукциона: **Гродненская область, Лидский район, Третьяковский с/с, в р-не дер. Долина (территория СЭЗ «Гродноинвест», 0,7 км от Лидской окружной городской дороги).**

Земельный участок с кадастровым номером 423685400024000001, назначение – обслуживание производственной территории.

Стоимость имущества – **18 913 637 840 рублей с НДС.**

Сумма задатка – **1 891 363 784 бел. рубля.**

Сумма шага аукциона составляет **5%** от начальной цены предмета аукциона.

Продавец имущества – **ОАО «Гродноопторг» (230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62, тел. для организации осмотра (044) 5660051, управляющий (029) 6822962).**

Организатор аукциона – **СООО «Глобал Тауэр» (220123, г. Минск, ул. Старовиленская 131-7, тел. (033) 9028379).**

Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, по каждому из предметов аукциона, на которые регистрируется заявитель, на р/с № 3012127410010 Региональная Дирекция № 400 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гродно, БИК 369, получатель – ОАО «Гродноопторг», УНП 500013881.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с предметом аукциона; копию свидетельства о гос. регистрации (для юр. лиц и ИП); копию Устава (для юр. лиц); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования (для иностранных юр. лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества без учета НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в порядке, предусмотренном договором купли-продажи. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (покупатель) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения.

**Аукцион проводится 27 октября 2014 года в 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Заявления и документы подаются с 20 до 24 октября 2014 года включительно с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Заявления также можно присылать почтовым отправлением с уведомлением о вручении. Срок окончания подачи заявок – 24.10.2014 г.**

**Телефоны для консультаций и справок:**
(044) 5660051, (033) 9028379, (029) 6822962.
**Сайт в интернете: www.opttorg.grodno.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

| № предмета аукциона | Наименование | Инвентарный номер | Начальная цена, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль МАЗ 437040 062 (2004 г.) | 218 | 107 601 600 |
| 2 | Автомобиль МАЗ 53366 (1999 г.) | 79 | 84 304 800 |
| 3 | Автомобиль МАЗ 437041-262 (2007 г.) | 70071 | 146 799 600 |
| 4 | Автомобиль ГАЗ-3110 (2000 г.) | 70021 | 13 152 000 |
| 5 | Автомобиль ГАЗ-53 (1988 г.) | 7947 | 20 968 800 |
| 6 | Автомобиль ГАЗ-330210 (1995 г.) | 70011 | 29 265 600 |
| 7 | Автомобиль МАЗ 54323 (1997 г.) | 3100 | 98 421 600 |
| 8 | Автомобиль Форд Транзит (1998 г.) | 70104 | 69 118 800 |
| 9 | Автомобиль MERCEDES-BENZ 1622 (1986 г.) | 70042 | 92 406 000 |
| 10 | Автомобиль Рено Эспейс (2000 г.) | 70098 | 9 418 800 |
| 11 | Прицеп 2ПТС4 (1990 г.) | 207 | 11 889 600 |
| 12 | Прицеп МАЗ-8373000-3010 (2007 г.) | 70079 | 67 318 800 |
| 13 | Полуприцеп МАЗ 93866-040 (1997 г.) | 3101 | 54 015 600 |
| 14 | Прицеп МАЗ-83781 (1999 г.) | 87 | 80 431 200 |
| 15 | Автопогрузчик 4014 (1993 г.) | 393 | 21 123 600 |
| 16 | Автопогрузчик 4081 (1989 г.) | 154 | 45 619 200 |
| 17 | Автопогрузчик 4081 (1991 г.) | 162 | 48 661 200 |
| 18 | Автопогрузчик ДВ 1792(1991 г.) | 20 | 69 369 600 |
| 19 | Пресс двухкамерный тип МК 2500 № 1038 (2007 г.) | 70048 | 128 192 400 |
| 20 | Пресс пакетировочный гидравлический вертикальный УЖИМ 401-01 (2009 г.) | 70126 | 36 121 200 |
| 21 | Пресс пакетировочный гидравлический вертикальный УЖИМ 401-01 (2009 г.) | 70127 | 36 121 200 |
| 22 | Пресс ПК 12 93 002 (1994 г.) | 17 | 101 770 800 |
| 23 | Пресс трехкамерный тип МК 2500 № 305 (2007 г.) | 70077 | 144 216 000 |

Место нахождение предмета аукциона – **230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62.**

Сумма задатка – **10%** от первоначальной цены предмета аукцина.

Сумма шага аукциона составляет **5%** от начальной цены предмета аукциона.

Продавец имущества – **ОАО «Гродноопторг» (230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62, управляющий (029) 6822962).**

Организатор аукциона – **СООО «Глобал Тауэр» (220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131-7, тел. (033) 9028379).**

Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, по каждому из предметов аукциона, на которые регистрируется заявитель, на р/с № 3012127410010 Региональная Дирекция № 400 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гродно, БИК 369, получатель – ОАО «Гродноопторг», УНП 500013881.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором торгов день и время, указанные в извещении о проведении торгов. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в течение 1 (Одного) месяца со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (Пять) процентов.

Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения.

**Аукцион проводится 28 октября 2014 года в 15.00 по адресу: 230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62. Заявления и документы подаются с 20 до 24 октября 2014 года включительно с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Срок окончания подачи заявок – 24.10.2014 г.**

**Телефон для организации осмотра предметов аукциона:**
(044) 566 00 51.
**Телефоны для консультаций и справок:**
(033) 902 83 79, (029) 682 29 62.
**Сайт в интернете: www.opttorg.grodno.by**

Кумiры

# НАС «ПАЗНАЁМІЛІ» РОЛІКІ

**На першы погляд падаецца, што Дзіма — цяжкі ў стасунках чалавек, але гэта не так. Адметнымі рысамі яго характару з'яўляюцца прастата, адкрытасць, дабрыня і шчырасць. З ім заўсёды ёсць аб чым пагутарыць. А пазнаёмілася я з ім у інтэрнэце дзякуючы... ролікам.**

Дзіма АЗАРКА.

Аднойчы я вырашыла заняцца якой-небудзь справай сур'ёзна. Выбрала ролікавыя канькі, якія сёння з'яўляюцца галоўным маім хобі. Наглядзеўшыся розных відэа, даведалася пра беларускую каманду ролераў, у якую ўваходзіць Дзіма, і пачала з імі сябраваць.

Спачатку тэмай нашых з Дзімам размоў была агульная цікавасць да ролікавых канькоў, але пасля я даведалася пра іншыя яго хобі. Іх разнапланавасць мяне здзівіла: я ніколі не думала, што чалавек можа сумяшчаць такія не падобныя заняткі. Дзіма захапляецца таксама скейтбордам, канькамі, снаўбордам і нават... арыгамі. Вучыцца ва ўніверсітэце і нядрэнна ўсё гэта спалучае.

На каньках Дзіма пачаў катацца ва ўзросце 15 гадоў і з таго часу займаецца ролер-спортам ужо каля шасці гадоў. Ён спрабаваў сябе ў розных стылях катання, а нядаўна вырашыў спыніцца на «фрыскейце» (уключае ў сябе скачкі з трамплінаў, у вышыню і вольнае катанне па горадзе). Разам з сябрам яны надумалі стварыць школу і каманду. І іх мары ажыццявіліся. У Мінску ёсць ролер-школа, крама з усімі патрэбнымі для катання рэчамі. Каманда InMove удзельнічае ў розных спаборніцтвах, выступае з паказамі, ладзіць мерапрыемствы.

Дарэчы, калі я буду вучыцца ў Мінску (вельмі спадзяюся на гэта), адна з маіх галоўных мар — уступіць у іх каманду, каб бліжэй пазнаёміцца з гэтымі цікавымі спартсменамі.

Мне вельмі падабаюцца Дзімавы планы і яго адданасць любімай справе. У будучыні ён хоча развіваць ролер-спорт у Беларусі, рыхтаваць маладых спартсменаў, а таксама дапамагаць маленькім гарадам, дзе пакуль няма магчымасцяў самастойна развіваць гэтае хобі.

Напэўна, з Дзімы можна браць прыклад. Не кожны чалавек здольны дасягнуць усяго гэтага: стварэнне каманды, школы, адкрыццё крамы... Ён стараецца ў першую чаргу не дзеля сябе, а дзеля іншых людзей. Дзіма па-сапраўднаму верыць, што беларускія ролеры нічым не горшыя за іншых і могуць выйсці на сусветны ўзровень у гэтым відзе спорту. Для мяне Дзіма — прыклад адвагі і шчырасці, дабрыні і цвёрдасці.

**Кацярына БУХЦІНАВА,**
**вучаніца 11 класа Бярозаўскай СШ №3 Лідскага раёна.**

Простыя iсціны

# КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ПРЫСТУПКА ДА СЯБЕ

**Кругаварот людзей у прыродзе... Так, менавіта так, як бы дзіўна гэта ні гучала на першы погляд. Гэтак жа, як мяняюцца мода, надвор'е, інтарэсы, змяняецца і наша асяроддзе. Вы ніколі не заўважалі, што як толькі з вашага жыцця знікае адзін чалавек, на яго месцы неўзабаве з'яўляецца іншы? Нібы кожнаму адмерана пэўная колькасць сяброў і знаёмых, якая не павінна змяняцца. «Замена» можа быць зусім нечаканай. Гэта могуць быць абсалютна розныя людзі, і незразумела, як вы маглі мець стасункі і з тым, і з тым. Напрыклад, на месцы несур'ёзнай рагатушкі з'яўляецца аматар філасофіі. Яны розныя, а вы — адзін.**

А можа, мы проста «вырастаем» са сваіх знаёмых, як са старых штаноў? «Носім» іх да апошняга, церпім усе звязаныя з гэтым нязручнасці, але ў выніку ўсё роўна прыйдзецца знайсці новыя. І толькі адзінкі (тыя людзі, якія як любімая футболка, якая заўсёды па памеры, якую мы цыруем па дзесяць разоў, аддаём у хімчыстку і ніяк не адважваемся выкінуць) застаюцца з намі назаўжды.

Кожны ўносіць нешта ў наша жыццё, а сыходзячы, пакідае кавалачак сябе: нейкую фразу, звычку, агульныя ўспаміны. На кожным этапе жыцця нам патрэбныя пэўныя людзі: вясёлыя сябры ў школе, добрыя дарадчыкі — калі вырасцеш. І тыя, хто выслухае ў старасці.

Людзі будуць прыходзіць і сыходзіць, хтосьці толькі прамільгне на вашым жыццёвым шляху, іншыя пакінуць у ім свой след. Трэба шанаваць тых, хто побач, але трэба ўмець і адпускаць. Мы не ведаем, хто чакае нас за наступным паваротам і чым ён для нас стане.

Кожны чалавек, які сустракаецца на нашым шляху, невыпадковы. Азіраючыся назад, не ўяўляю, кім бы я была цяпер, калі б у маім жыцці не было б усіх тых людзей, каго я ведаю. Гляджу на вялікую колькасць знаёмых, сяброў і прыяцеляў, з якімі маю стасункі кожны дзень, часам прыгадваю некага з мінулага і разумею, які велізарны ўплыў аказалі гэтыя людзі розных узростаў, становішчаў і характараў на мяне і мой свет.

Людзі прыходзяць на імгненне, на час, на ўсё жыццё. Першым і другім наканавана сысці, інакш у нас проста не застанецца часу і сіл на новыя сустрэчы. Часам людзі адыходзяць, як бы растваряючыся ў часе. Некаторыя сыходзяць без папярэджання. Першы варыянт расставання бязбольны, другі — рэжа па жывым. Першы — натуральны, другі — патрэбны ці непазбежны. Але след усё роўна застаецца, толькі б не заставалася крыўдаў.

У кожнага чалавека была свая роля ў маім жыцці — у масоўцы, у эпізодах або на першых ролях. Адзін цікавы і разумны суразмоўца сказаў мне: «У кожнага свой шлях у гэтым жыцці, і хто ведае, колькі яму наканавана прайсці прыступак... Людзей-прыступак». Усе людзі ў нашым жыцці ў пэўным сэнсе — прыступкі. Адны вядуць ўгору, іншыя — уніз; хтосьці — шырокая прыступка, нехта — зусім вузкая, але ўсе яны патрэбны і неабходны. Іх нельга выкінуць, па-дурному адмесці, іх проста трэба прымаць і радавацца рэчаіснасці.

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**вучаніца 11 класа Наваполацкай гімназіі №2.**

Не напаказ

# «ДАРАСЦІ» ДА ПРАЎДЫ

**Здаецца, на доўгі час знікае чалавек з твайго жыцця, а праз колькі гадоў навіны пра яго выклікаюць як мінімум здзіўленне. Вось тут тая ж гісторыя. Дзяўчына, што захавалася ва ўспамінах як самая, мякка кажучы, «адвязная» асоба сярод усіх маіх знаёмых, раптам выдала: «Ах, наша вянчанне!». Яна распісвала падрабязнасці падзеі так, нібыта расказвае аб іх першы і апошні раз.**

Усё як належыць: вэлюм, сукенка, госці, мамы жаніха і нявесты пусцілі слязу напрыканцы цырымоніі. Я глядзела на здымкі і чамусьці згадвала расповеды крыху іншага характару, якія расказваліся з не меншым запалам. Тады яны прагаворваліся шэптам, было шмат «цікавага»: дарослыя кавалеры і «дарослыя» ўчынкі, серыя прыгод пра тое, як не начавала дома... Трэба сказаць, падрабязнасцяў ніхто ніколі не выпытваў, ініцыятар агучвання чарговай гісторыі заўжды быў адзін і той жа...

— А рашэнне аб вянчанні тваё ці мужа? — намагалася я высветліць прычыну такога сур'ёзнага кроку.

— Ведаеш, у мяне сястра вянчалася. Здаецца, жывуць нядрэнна. Мы падумалі, што лішнім не будзе, — пачула ў адказ. Усё аказалася больш чым проста...

Вядома, чалавек мог кардынальна змяніцца, але паразважаць зараз хочацца зусім не пра нейкую канкрэтную асобу, а пра тое, наколькі шчырымі, значнымі і сапраўднымі бываюць нашы духоўныя памкненні ў выпадку, калі насамрэч да іх трэба яшчэ расці і расці...

Вось хіба не «дарос» да чагосьці значнага чалавек, які займаецца дабрачыннасцю? Безумоўна, у той асобы павінна быць і ахвярнасць, і высакароднасць, і пачуццё адказнасці, якое выходзіць за межы ўласнай сям'і. Толькі вось калі чытаеш інтэрв'ю з якой-небудзь «зоркай» і бачыш там добрых пару абзацаў пра дапамогу хворым дзецям і непасрэдны ўдзел у гэтым, першае пачуццё — зусім не захапленне. Адзін расійскі журналіст у сваім дакументальным фільме пра конкурсы прыгажосці паказаў, як дзяўчаты, удзельніцы мерапрыемства, прыязджаюць у дзіцячы дом. Вядома ж, у дабрачынных мэтах. Раптам высвятляецца, што адна з прыгажунь не па чутках ведае, як жыць без бацькоў. Адной маленькай дзяўчынцы на развітанне яна пакінула шчырыя, на першы погляд, абяцанні.

— Я вырашыла ўдачарыць яе! — зрабіла сенсацыйную заяву на камеру міс.

А вось працяг гісторыі: журналіст праз некалькі месяцаў тэлефануе ў дзіцячы дом і пытаецца пра лёс той самай дзяўчынкі, якой далі абяцанне пра новую сям'ю. Аказваецца, пасля гэтага візіту ніхто нават не тэлефанаваў...

Дык што значыць «дарасці» да той ці іншай праявы шчырасці? Па-мойму, гэта бачыць вынік любога, нават самага лепшага свайго ўчынку. Бо найбольш сумнае ў такіх выпадках — чаканне «прыза», які павінен атрымаць галоўны герой падзей. Чалавек, напрыклад, уяўляе вянчанне своеасаблівым «амулетам», які дапаможа зберагчы адносіны, у дабрачыннасці бачыць магчымасць стаць «супергероем», а атрымлівае ў выніку зусім не тое, што чакаў...

...Па-мойму, першы крок да шчырых учынкаў і ўнутранага шчасця — гэта казаць праўду самому сабе. У тым ліку, якім ты бачыш свет, на што маеш сілы і да чаго гатовы. І нават калі ты пакуль яшчэ не дарос, саромецца гэтага факта не варта.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

Сакрэты поспеху

# МАЛЕНЬКІЯ ДЗЕТКІ — ВЯЛІКІЯ ТАЛЕНТЫ

**...Калі прыйшла ў наваполацкі Палац дзяцей і моладзі на фестываль дзіцячай песні «Бэбі-шоу», адразу прыгадала той дзень, калі яшчэ вучаніца пачатковай школы спявала разам з дзяўчынкамі песню «Небыліцы» на сцэне тагачаснага Цэнтра пазашкольнай работы. Гэта быў мой дэбют у гарадскім фестывалі дзіцячай песні «Бэбі-шоу». З таго часу прайшло цэлых сем гадоў, але, па сутнасці, тут нічога змянілася: усё тыя ж усмешкі на тварах дзяцей, усё тыя ж усхваляваныя матулі папраўляюць малым гальштукі і прычоскі, усё тая ж сцэна, упрыгожаная шарамі і яркімі літарамі...**

Фестываль — гэта свята для гледачоў, выпрабаванне для ўдзельнікаў і праца для арганізатараў. Пасля таго, як граматы і прызы знайшлі сваіх уладальнікаў, пагутарыла з метадыстам аддзела музычна-харэаграфічнай творчасці Алесяй Канцыял.

— Што скажаце аб прафесіяналізме ўдзельнікаў?

— Арганізатары і члены журы адзначаюць, што з кожным годам расце не толькі іх колькасць, але і майстэрства юных вакалістаў. Выходзячы са штогадовых назіранняў, можна адзначыць, што дзеці становяцца больш разняволенымі, адкрытымі. І гэта вельмі радуе! Асабліва прыемна, калі тыя, хто не першы год удзельнічае ў фестывалі, становяцца заслужанымі пераможцамі! Так, Сафія Шыманская, салістка тэатра песні «Бэбі-шоу» Палаца дзяцей і моладзі, стала ўладальніцай гран-пры фестывалю.

Калі гаворка зайшла аб удзельніках фэсту, я падзялілася з Алесяй Генадзьеўнай сваімі назіраннямі. Сярод удзельнікаў было нашмат больш дзяўчынак, чым хлопчыкаў, але затое хлопчыкі вылучаліся сваёй арыгінальнасцю і атрымалі самыя бурныя апладысменты гледачоў. Напрыклад, Павел Фланчаў, які заняў другое месца ў сваёй узроставай катэгорыі, ужо з першых секунд прыцягнуў увагу ўсёй залы, выканаўшы знакаміты «скачок Дзімы Білана». Некалькі песень было выканана на роднай мове, што вельмі парадавала.

Падчас перапынку пагутарыла з адной з канкурсантак — Міланай Міцейка. Тады яна яшчэ не ведала, што ў сваёй катэгорыі стала лепшай. Дзяўчынка ўжо не першы раз удзельнічае ў фестывалі, але раней яна спявала не адна, а ў калектыве. Юная спявачка прызналася, што трошкі хвалявалася. Але яе прыйшлі падтрымаць бацькі, бабулі, сябры і выкладчык па вакале, таму дзяўчынка была ў сабе ўпэўненай. «Я дакладна ведаю, што зноў падымуся на сцэну Палаца дзяцей і моладзі, каб прыняць удзел у фестывалі дзіцячай песні «Бэбі-шоу», — упэўнена кажа Мілана. А мне застаецца толькі пажадаць дзяўчынцы поспехаў.

Захацелася б даведацца, якія сюрпрызы будуць на X юбілейным фестывалі «Бэбі-шоу» сёлета?

— Планаў шмат. Працэс падрыхтоўкі — гэта тытанічная праца, гэта неабходнасць глядзець у розныя бакі адначасова і не выпускаць ні адной дэталі, таму для пачатку неабходна стварыць каманду, якая ўвасобіць усе нашы задумкі і задумы ў жыццё! — кажа Алеся Канцыял. — Раскрываць усе сакрэты мне б не хацелася, але трохі заслону прыадчынім: плануюцца майстар-класы ад прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі Наваполацка і Полацка, трансляцыя відэакліпаў лепшых удзельнікаў і пераможцаў фестывалю, адкрыццё фотагалерэі «Яны патрапілі ў дзясятачку!». На юбілейным фестывалі, вядома, хацелася б убачыць тых, хто стаяў ля вытокаў першага фестывалю, тых, хто ўсе гэтыя гады рабіў яго гісторыю. Бо менавіта высокі прафесіяналізм гэтых людзей стварыў фестывалю добрае імя!

Напрыканцы Алеся Генадзьеўна пажадала фестывалю новых сяброў, спонсараў, натхняльнікаў, якія ў далейшым будуць дапамагаць развівацца і фінансава падтрымліваць таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак.

**Лізавета МАЙСЯЁНАК,**
**студэнтка I курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
25 09 2014 г.

SEX=БАЛЯСЫ

# КАЛІ ПРЫРОДА БЯРЭ СВАЁ

«А любовь, как сон, а любовь, как сон, — гучна разносіўся над пасёлкам голас юнака, — а любовь, как сон, стороной прошла...» Ці то хлопец проста дурыўся, ці то сапраўды нешта прайшло... Позна ўвечары я выйшаў на двор, прытуліўся да калодзежа, закурыў, слухаў гэты голас уначы і радаваўся за сябе — ёсць, аказваецца, людзі, якія могуць спяваць яшчэ горш! А потым нават крыху пазайздросціў, прыгадаўшы, як і мы некалі хадзілі кампаніяй па пасёлку і пад гітару спявалі «Дэмбеляў»: «...Буду пить и гулять, буду женщин ласкать и о службе своей вспоминать». «Што кажаш, хлопчык?» — як любіць паўтараць капітан каманды КВЗ «Камызяцкі край» — ловіш на тым, што ў мяне ні слыху, ні голасу? Дык, як гаворыцца ў адным анекдоце, у групавым спяванні — як у групавым сексе: заўсёды прафілоніць можна. Але ж гаворка не пра тое.

Вернемся да вышэйпамянёнага юнака, чыім голасам хіба толькі ў адным вядомым месцы «Занята!» крычаць... Калі б размова ішла пра горад, пэўна ж, пасля такіх спеваў пад вокнамі ў многіх жыльцоў рука ужо пацягнулася б да тэлефона — нарад міліцыі выклікаць. Кшталту як у той мініяцюры каманды КВЗ «Стомленыя сонцам» пра найноўшую аўтамабільную сігналізацыю. (Падыходзіць да аўто хлопец, а разумная сігналізацыя яго адразу папярэджвае: «Адыдзі, бо Сярогу пазаву!» Той не рэагуе, б'е нагой па колах. Сігналізацыя не вытрымлівае, і на ўвесь двор разносіцца: «Ся-ро-га! Ся-ро-га! Ся-ро-га...») А ў вёсцы — зусім іншая справа. Тут брэх сабак і спевы пра няшчаснае каханне толькі напаўняюць атмасферу сэнсам і прыкметамі жыцця. «Добра ж як, Машанька!» — «Я не Машанька!» — «Усё роўна добра!» Гэта я ні ў якім разе не ў ганебным сэнсе пра вёску, а зусім наадварот. Гарадскім добра — у іх агні, транспарт дапазна шуміць. А ў сельскай мясцовасці як сцямнела, дык і сціхла ўсё. Затое душэўнасці паболей будзе.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Не, ну сапраўды, дзе ж яшчэ магло прагучаць вядомае з фільма «Формула кахання», як не ў вёсцы: «Хочаш вялікага, але чыстага кахання?.. Тады прыходзь сёння ноччу ў адрыну...» Мне заўсёды было шкада «дзяцей асфальту» («Дзеці гор. У сэнсе горцы», гаварыў дзед Міця з «Кахання і галубоў») — гарадскіх падлеткаў, якія, не маючы магчымасці бавіць час на прыродзе, мусяць бязвылазна знаходзіцца у тлумным і душным горадзе.

**Прырода — вялікая сіла. Толькі галоўнае, каб гэта мы на яе ўлонні адпачывалі. А сама прырода каб не адпачывала ні на нас саміх, ні на нашых блізкіх!**

Вось скажыце, вы калі-небудзь плавалі ў рацэ пад зорным небам? «Ши-икарный вид!», гаварыў у такіх выпадках з характэрным акцэнтам Мішка Япончык з серыяла «Аднойчы ў Адэсе». Калі мноства зорак адбіваецца ў вадзе і не зразумела — у ёй ты плывеш ці ў самім небе?.. Калі нервы казыча адчуванне глыбіні, а вока — «русалка» побач у святле Месяца. І ці то водарасці да цябе дакранаюцца, ці то яна... Пайшлі неяк з будучай жонкай і сябрамі на шашлыкі. А потым на нас абрынулася навальніца. І мы, змоклыя да ніткі, накрыўшыся ўсе разам посцілкай з галавой, беглі праз поле да «цывілізацыі». Памятаецца дагэтуль. Як і тое, калі, наспех збіраючыся, я выпадкова кінуў у агонь яе сонцаахоўныя акуляры. Вось, давялося ажаніцца, каб неяк кампенсаваць тую страту. *(Жарт.)* Як у тым анекдоце. Бераг возера, заходзіць сонца. Прыгажосць. Ён і яна. «Мілы, можа, нам пажаніцца?» — «Давай». Доўгая напружаная паўза. «Мілы, а чаго ты маўчыш?» — «Здаецца, я і так ужо лішняга сказаў». Дарэчы, маладая каляжанка таксама любіла яшчэ зусім нядаўна ўдваіх з сужэнцам у лес на шашлыкі схадзіць. У дэкрэтным цяпер... «Я і не заўважыў, як зайшлі ў грэчку. А яна ўсё думае — пераходзім рэчку»... А па грыбы з дзяўчатамі выправіцца? Як там жартавала легендарная зборная БДУ — чэмпіён Вышэйшай лігі КВЗ? «Як добра пайсці ў лес! Ідзеш з ножыкам: тут — лісічка, там — баравічок. А грыбніка сустрэнеш, дык і грашыма разжыцца можна». Жартую, вядома. Хаця б ты грыбы тыя ўвогуле заўважыў... Сядзім вось так аднойчы за накрытай «палянай», а тут грыбнікі. І да нас! Маўляў, чым пахваліцца можаце? А ў нас з сабой ні вядзерцаў, ні кошыкаў. Ножык, праўда, быў — каўбаску наразаць...

Увогуле, тэма прыроды і кахання — як Чук і Гек, як Чып і Дэйл, як інь і янь, як Пуцін і Мядзведзеў. Заўсёды побач, заўсёды разам. «Когда яблони цветут, всем девчонкам нравится, чтобы им цветы дарили, — и красивым, и не красавицам...» Нават калі, як у «Каханні і галубах», наступае «фигура вторая — печальная», г.зн. разрыў адносін, зноў жа без навакольнага асяроддзя не абысціся. Як спявае група «Божая кароўка», «ты останешься одна среди берёз, ты прольёшь ещё немало горьких слёз...» Ну, а чаго здзіўляцца, калі ў яго замест сэрца — гранітны камень? Трэба ж бачыць, каго выбіраеш. Памятаеце, як да пытання самапрэзентацыі творча падышоў Георгій Іванавіч, ён жа Гога, ён жа Гоша, ён жа Юрый, ён жа Гора, ён жа Жора з фільма «Масква слязам не верыць»? Па-першае, месца правільнае выбраў. Дзе? Зразумела ж, на прыродзе! Каб вока парадаваць пастаральным пейзажам. Па-другое... «Не-не-не, шашлык жаночых рук не церпіць. Вунь ідзіце туды, вашы месцы ў глядзельнай зале». І пледзікам цёпленькім так сціпла ножкі прыкрывае («залатыя рукі», як гаварыў пра Георгія Іванавіча адзін з яго сяброў на гэтым самым пікніку), маўляў, адпачывай, даражэнькая. Малайчына! Якая жанчына зможа ўстаяць перад такім падыходам? А ўжо дараваць, што схлусіў пра дзень нараджэння, які насамрэч у снежні, дык якая драбяза ўсё гэта!.. Так што прырода — вялікая сіла. Толькі галоўнае, каб гэта мы на яе ўлонні адпачывалі. А каб сама прырода не адпачывала ні на нас саміх, ні на нашых блізкіх!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «НЕБА МЯНЕ АБЕРАГАЕ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сама ж конкурсы выбірала, сама ездзіла на іх. І тады не ўзнікала думак кшталту: маўляў, «вось там рэжысёр з Піцера пакінула свае каардынаты — значыць, трэба паехаць на праслухоўванне». Цяпер жа ў мяне пачынаецца новы этап. Напрыклад, падчас аднаго з апошніх конкурсаў у Новарасійску (на конкурсе «Марскі вузел» Вольга заняла сёлета першае месца. — **Аўт.**) мы мелі магчымасць пазнаёміцца з мэрам горада. Лаўрэаты атрымалі шанц прыехаць у горад на іншыя канцэрты. Таксама члены журы з Масквы пакінулі свае кантакты і папрасілі даслаць ім наш матэрыял. Таму сёння я ўжо не толькі займаюся творчасцю, але і спрабую рабіць нейкія крокі па яе прасоўванні.

**Усюды прапагандуюцца нейкія мадэлі, шаблоны шчаслівага існавання — гэта ўсё пустое. Я лічу, што перш за ўсё трэба слухаць сваё сэрца і рабіць тыя крокі, якія напаўняюць цябе гармоніяй. Жыві, не здраджваючы сабе, — вось з чаго пачынаецца мая музыка.**

*Бацькі, дарэчы, жаданне адзінай дачкі зрабіць кар'еру спявачкі падтрымліваюць. А яна сама некалі вельмі баялася расчароваць іх сваім выбарам. У школе была выдатніцай і збіралася паступаць на юрыдычны факультэт БДУ. Калі ж паступленне супала з чарговымі конкурснымі «гастролямі», Вольга зразумела, што збочыць з гэтага шляху не можа. І пайшла вучыцца ва Універсітэт культуры, потым выкладаць у музычнай школе №1 Мінска, у сценах якой сама некалі спасцігала «азы» музыкі. З дзецьмі дзяўчына працуе ўжо амаль пяць гадоў, дзякуючы чаму не губляе вельмі важнага — здольнасці марыць:*

— Побач з імі я гляджу на свет шырока расплюшчанымі вачыма, і хочацца верыць толькі ў лепшае. У такія моманты я нібы нешта ўваскрашаю ўнутры сябе, няхай дзіцячае, наіўнае, але гэта дорыць новыя адкрыцці, магчымасць глядзець на звычайныя рэчы па-новаму. І, галоўнае, дзеці — мой стымул не стаяць на месцы.

***— А музыка здольная стварыць цуд?***

— Мастацтва наогул лечыць душы людзей, духоўна ўзбагачае нас. Я, напрыклад, адчуваю гармонію, наведваючы цікавы канцэрт. І магчымасць дасягнуць гэтага стану і ёсць для мяне праява цудадзейных уласцівасцяў музыкі.

*Яе галоўныя мары сёння пра тое, каб былі здаровымі блізкія. А шчаслівай яе робіць любімая праца. Вольга прытрымліваецца класічнага рэцэпту:*

— Для поспеху неабходна 99 працэнтаў працавітасці. Я бачыла розных людзей: адным не хапае самаарганізацыі, другім — чалавека, які накіраваў бы да дасягнення мэты, і тады яны губляюцца, талент раствараецца. А калі працуеш, працуеш, то так лёгка не здаешся.

Трупа студыі «КОД'А».

***— А як прыйшлі да думкі, што творчасць можа прыносіць яшчэ і дывідэнды?***

— Мабыць, наступіў момант, калі зразумела, што час сыходзіць, а да нейкага канкрэтнага выніку я не наблізілася. Таму зрабіла нават творчы перапынак — два гады маўчання без стварэння песень і вершаў. Вырашыла, што трэба нешта змяняць, прычым карэнным чынам. Пачалося ўсё з паступлення ў Акадэмію мастацтваў, куды я прыйшла, каб паглядзець, што такое акцёрскае майстэрства, сцэнічная мова — словам, захацелася глыбей капаць, бо выкананне і складанне музыкі — адна справа, а вось артыст і яго сцэнічная рознабаковасць — зусім іншае. У творчай атмасферы знайшла штуршок да далейшага развіцця. Праца над сабой, сустрэча з Арцёмам (Арцём Еўсіевіч — малады рэжысёр, разам з якім Вольга стварыла эксперыментальную студыю-школу музычнага і тэатральнага мастацтва «КОД'А». — **Аўт.**), чалавекам-вар'ятам, калі казаць пра яго імкненні і творчыя задумкі, а тут яшчэ і мой аднакурснік Антон падключыўся (Антон Шакулін — малады кампазітар-аранжыроўшчык; у творчым тандэме з хлопцамі быў створаны мюзікл «Прафесія ГрусТнік». — **Аўт.**), з якім працую над першым музычным альбомам. Можа, гэта таксама знак лёсу?

**Часта бываю ў раз'ездах і ведаю, наколькі важна адчуваць падтрымку родных, калі ты далёка. Як бы пафасна тое ні прагучала, але я люблю нашу краіну, бо тут мой дом, мая сям'я.**

***— Чым збіраецеся зацікавіць аўдыторыю?***

— Мы знялі першы кліп на песню «Мой дом». Пакуль што я яшчэ не магу спыніцца і неяк ацэньваць зробленае. Я поўнасцю аддаюся працэсу, а час пакажа, наколькі наша праца прадуктыўная, адгукнецца на яе нехта альбо не. Першы крок зроблены, працуем над новымі песнямі. Перадусім хачу, каб быў свой рэпертуар. Для мяне гэта перш за ўсё маё слова ў музыцы. Нават нядаўна ў Іспанію наведалася з мэтай паказаць сваю творчасць. Бо я ўжо вырасла з конкурсаў і цяпер маю патрэбу гаварыць пра іншыя рэчы на сваёй мове.

***— З бачаннем уласнага стылю, тэматыкі ў творчасці ўжо вызначыліся?***

— Ведаеце, я доўгі час выконвала розныя кампазіцыі, не ведаючы, чаго хачу дакладна. Рабіла спробы ў напісанні музыкі, хоць і не адношу сябе да кампазітараў. А цяпер бачу, якую лінію мне трэба развіваць. Як аўтар, я цікаўлюся філасофскімі тэмамі. Напрыклад, першая кампазіцыя «Мой дом»: як бы далёка ні імкнуўся чалавек зайсці ў сваіх памкненнях, ён сэрцам заўсёды вяртаецца ў родныя сцены. Сама часта бываю ў раз'ездах і ведаю, наколькі важна адчуваць падтрымку родных, калі ты далёка. Як бы пафасна тое ні прагучала, але я люблю нашу краіну, бо тут мой дом, мая сям'я. І першая песня адлюстроўвае ўсё тое, чым я даражу. Мяне хвалюе тэма месца чалавека ў сучасным свеце, мне блізкая гарадская лірыка, напоўненая фарбамі пачуццяў і перажыванняў людзей, якія вечна знаходзяцца ў пошуках сэнсу жыцця. У наступнай песні, над якой мы працуем, «Гук за сцяной», я расказваю якраз пра тое, што часта ў гонцы за поспехам мы прыходзім да фінішу, не адчуваючы шчасця і задавальнення. Бо ўсюды прапагандуюцца нейкія мадэлі, шаблоны шчаслівага існавання — а гэта ўсё пустое. Я лічу, што перш за ўсё трэба слухаць сваё сэрца і рабіць тыя крокі, якія напаўняюць цябе гармоніяй. Жыві, не здраджваючы сабе, — вось з чаго пачынаецца мая музыка.

*Сёння Вольга рыхтуецца сказаць сваё слова як музыкант, якому ёсць чым падзяліцца. Ці не баіцца гэтая пяшчотная дзяўчына трапіць у асяродак шоу-бізнесу, дзе можна сутыкнуцца з нядобразычлівасцю і зайздрасцю...*

— Мне ўжо неаднойчы даводзілася сутыкацца з праявамі таго, пра што вы кажаце, але неба мяне аберагае. Таксама лічу, што маю дастаткова моцны характар, а ў такіх сутыкненнях выпрацоўваецца ўнутраны стрыжань.

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.063.
Нумар падпісаны ў 19.30 24.09.2014 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***Праблемы школьнага выхавання заўсёды хвалявалі пісьменнікаў. Праўда, што тычыцца падлеткавай літаратуры, то беларуская проза дваццатага стагоддзя, думаецца, засталася ў пэўным даўгу перад чытачом: твораў, якія і сёння не страцілі сваёй актуальнасці і прыцягальнасці, не так ужо і шмат. А ўявім, што настаўнік Іван Фёдараў да самай пенсіі так і выкладаў у школе геаграфію ды гісторыю і не стаў славутым пісьменнікам Янкам Маўрам...***

***І вось, нібы наганяючы ўпушчанае, сучасныя беларускія празаікі пачалі шмат пісаць для і пра падлеткаў. Апошнім часам актывізаваўся ў гэтым жанры і Ягор Конеў: пастаянныя чытачы часопіса «Маладосць», магчыма, памятаюць яго аповесць «Новыя палескія рабінзоны», надрукаваную там у 2011 годзе. Такую актыўнасць можна толькі вітаць, а самім пісьменнікам ёсць да чаго імкнуцца: хоць і не зусім справядліва ў гэтым кантэксце параўноўваць розныя эпохі, усё ж, думаецца, зорка Янкі Маўра па-ранейшаму пасылае нам самае яркае святло са сваёй пакуль недасяжнай для сучаснікаў вышыні.***

**Алесь БАДАК**

Ягор КОНЕЎ

# СЦЯЖЫНА Ў МОРЫ

На маёй памяці апошнія дваццаць гадоў інтэрнэт не ганіў хіба толькі без'языкі. Называлі яго і сметніцай, і зброяй інфармацыйнай вайны, і магільшчыкам газет, але ніхто пры гэтым не адмовіўся ад спажывання рэсурсаў Глабальнай Сеткі. Асабіста я прытрымліваюся меркавання, што інтэрнэт — усяго толькі хуткасная пошта. Камусьці яна жыццё пагаршае, камусьці паляпшае — залежыць ад таго, хто і што той поштай дасылае. Хоць, умоўна кажучы, можна параўнаць інтэрнэт і з морам: на паверхні зіхаціць сонца розуму, а ў глыбінях тоіцца жахі падсвядомасці. Ды кожны здатны сам абраць напрамак (у цемру або да святла) і паводле душэўнага выбару пракладваць сваю сцяжыну ў бурлівай стыхіі быцця. А каб мая заява не падалася галаслоўнай, раскажу пра адзін выпадак.

**Апошнія** сем гадоў маім трывалым віртуальным сябруком з'яўляецца мой колішні аднакласнік Яўген. Мы з ім дваццаць гадоў не бачыліся пасля заканчэння школы, ды неспадзявана ён адшукаў маю старонку ў сацыяльнай сетцы і напісаў мне. Я адказаў яму. Так аднавіліся нашы неперыядычныя кантакты. Калі абодва «сядзелі» ў Сетцы, то перапісваліся ў чаце. Яўген пісаў мне часта, я адказваў яму рэдка, але школьнага таварыша гэта зусім не засмучала: відаць, мала хто гатовы быў яго наогул слухаць, а выгаварыцца яму хацелася. Такая ўжо натура была ў чалавека — не мог маўчаць пра тое, што хвалюе. А турбавала яго літаральна ўсё: ад глабальнага пацяплення да глабальнага пахаладання, ад чэмпіяната свету па хакеі да вайны ў Данбасе. Мае думкі, дарэчы, Яўгена мала цікавілі. Галоўнае для яго было выліць да донца плынь сваёй свядомасці. Таму са зместам ягоных пасланняў я знаёміўся няўважліва, адначасова «блукаючы» па розных сайтах.

Але нядаўні ліст Яўгена так мяне ўсхваляваў, што прачытаў не адрываючыся. Гаворка ў ім ішла пра тое, як зараз цяжка вучыцца ў школе. Зусім, маўляў, не тое, што раней!.. Падставаю для гнева паслужыла здарэнне з адзіным сынам Яўгена — сямікласнікам Максімам.

**Хлопцу** не пашанцавала: ён здаваўся надта разумным для свайго ўзросту. За глыбакадумны позірк настаўнікі завышалі яму адзнакі па сваіх прадметах, а вось аднакласнікі цкавалі і нават білі. Планіда «белай вароны ў крумкачовай зграі» незайздросная. Аднойчы хлопцы затрымалі яго на калідоры, збілі з ног і па чарзе выціралі падэшвы ботаў аб ягоны пінжак. Падняцца яму дазволілі з умовай:

— Кажы: «Дзядзечкі, даруйце малому паскудніку». Інакш горш будзе!

Максім паўтарыў.

Яму далі магчымасць стаць на ногі. Але гэтым усё не скончылася.

— Заўтра пашукаеш пяты кут у пакоі. Не знойдзеш — пашкадуеш...

Вярнуўшыся дадому, хлопец закалаціўся ў нервовай трасцы, істэрычна прасіў бацькоў, каб больш не гналі яго ў клятую школу...

«Ну, як Бог такое церпіць? — бушаваў Яўген. — Як такую гапату наогул пускаюць на школьны парог?»

«У кожнай кампаніі нягоднікаў ёсць свой завадатар, — напісаў я ў адказ. — З яго, відаць, здзекуюцца дома. Бацька або старэйшы брат... Падлеткі ў такім узросце самі анічога прыдумаць не могуць, адно капіруюць учынкі дарослых».

Ды Яўгена хвалявалі не псіхалагічныя прычыны дзіцячай жорсткасці, а вінаватыя сярод дарослых.

«Куды настаўнікі глядзяць? — з'явіўся на экране манітора ягоны патэтычны пасаж. — Чаму міліцыя такіх не затрымае?»

Іраптам я ўзгадаў, як трыццаць гадоў таму і сам Яўген — плячысты і высокі — наганяў страху на аднагодкаў. Шмат хто з аднакласнікаў блізка пазнаёміўся з ягоным кулаком. Часцей за іншых пападала ад Яўгена кульгаваму хлопцу, прозвішча якога было, здаецца, Халадзельскі. Здаралася, дасць хлопцу дыхту і загадае:

— Кажы: «Навошта я калекам нарадзіўся?»

Халадзельскі паўтараў (інваліда ніхто не бараніў, у нашым класе наглуха трымаліся прынцыпу, што кожны толькі за сябе), і Яўген паўдня хадзіў задаволены.

Я напісаў: «А ці памятаеш хлопца па прозвішчы Халадзельскі?» Аказалася, Яўген не толькі не забыўся пра яго, а нават рэгулярна праглядваў старонку Халадзельскага ў «Аднакласніках». Кульгавы хлапец вывучыўся на праграміста, з'ехаў у Нарвегію, ажаніўся з дачкой малдаўскіх эмігрантаў і часта змяшчаў у сваім акаўнце фотаздымкі пра падарожжы ў розныя куткі свету. На перапіску з Яўгенам, між іншым, не пагадзіўся, хоць той і напрошваўся ў спіс сяброў.

**Відавочна**, мая згадка сапсавала настрой Яўгену. Яго запісы зрабіліся карацейшымі, а паўзы паміж паведамленнямі — даўжэйшымі. Зразумела, ён не ўбачыў аніякай сувязі паміж сваімі ўчынкамі трыццаць гадоў таму і цяперашнім здзекам з роднага сына.

Завяршылася наша размова ў чаце рэзка. Толькі я параіў: «Варта паскардзіцца дырэктару школы. Або інспектару па справах непаўналетніх», як праз хвіліну атрымаў у адказ вымову: «Хіба я стукач? Ці хочаш адрадзіць традыцыі трыццаць сёмага года?.. Сын сам вінаваты, што церпіць знявагі. Хай вучыцца бараніць сябе. Школа выхавала з мяне сапраўднага мужыка. Няхай і ён пройдзе мой шлях!»

Псіхолаг, дагары яго нагамі!.. Вылаяўшыся пра сябе, я выключыў «комп». Настрой быў сапсаваны на ўвесь вечар.

***

Вальтэр Скот вуснамі аднаго са сваіх персанажаў сцвярджаў, што самае лепшае ў чалавечым жыцці — гэта здабыты досвед. Досвед Максіма зараз складаўся з успамінаў пра тое, як часта аднакласнікі «прасавалі» яго кулакамі, ставілі на калені перад дошкай, заганялі пасля ўрока фізкультуры ў адных трусах у раздзявальню дзяўчат ды шмат яшчэ чаго вытваралі, што падавалася смешным усім, толькі не яму.

Самае крыўднае — Максім не мог прыгадаць, калі пачаў ператварацца ў «белую ворону». Усё пачыналася пакрысе. Спярша абразы, на якія неахвотна адбрэхваўся, потым штуршкі ў плячо, а затым на яго пасыпаліся ўдары, ад якіх не паспяваў бараніцца. Кожны дзень ён ішоў у школу з кволай надзеяй, што нарэшце здзек з яго спыніцца. Але сітуацыя толькі пагаршалася. Хлопца зацкавалі амаль да паўжывёльнага стану.

**Хлопцу** і ў галаву не магло прыйсці, нібыта лёс помсціць яму за даўнія бацькоўскія правіны. Бацька колькі разоў заяўляў сыну, што лепшы сродак навучыць чалавека плаваць — завезці на лодцы ў мора і выкінуць за борт. Вось Максім і цялёпкаўся пасярод мора адчаю без усялякай надзеі на падтрымку. І цяпер яму нясцерпна хацелася сысці ў змрок смерці, дзе наўрад ці будзе горш.

Хлопец усур'ёз абдумваў верагодны шлях сыходу — вяроўка на шыю, крок з даху вышыннага будынка або скачок пад колы цягніка ў метро? Ён асцерагаўся: а раптам нешта не заладзіцца і замест гарантаванай смерці застанецца на ўсё жыццё паралізаваным інвалідам? Адзінота, у якой захлынаўся, замінала звярнуцца да кагосьці па параду ці нават проста распавесці пра свой боль. Бацька адно паўтараў, што сын ужо дарослы і мусіць сам вырашаць уласныя праблемы. (Такім чынам Яўген выгадваў сабе вольны час, які збольшага расходаваў на размовы ў «чаце».) Вось Максім і прымаў першае адказнае рашэнне ў сваім жыцці — яно павінна было стацца і апошнім.

***

Як сведчыць статыстыка, кожныя сорак секунд у свеце хтосьці зводзіць рахункі з жыццём. І калі Максім ужо гатовы быў далучыцца да гэтага страшнага шэрагу, калі бліскучыя рэйкі метрапалітэна падаваліся яму дарогай да шчаслівага супакою, у гісторыю ўмяшалася найноўшая тэхналогія. А дакладней — дасведчаны карыстальнік рэсурсаў Сеткі і, так ужо лёс распарадзіўся, аднакласніца Максіма Ганна-Марыя (бацькі назвалі яе так у гонар бабулі па лініі мужа і жонкі).

Яшчэ ў пачатковай школе Ганна-Марыя зарэгістравалася ў сацыяльных сетках, дзе наракла сябе «Анты-Барбі» і не без горычы напісала, што яе «фрэнд-зона» не надта шырокая. Затое, маўляў, носіць акуляры зусім, «як у Гары Потэра». І таксама, як культавы хлопчык-чараўнік, не песціла сваю адзіноту, а спасцігала магію чалавечых стасункаў — дапамагала ёй у гэтым актыўнае засваенне рэсурсаў «Укантакце» і «Фэйсбука». У выніку займела віртуальных сябрукоў у Ханты-Мансійску і ў Карагандзе, у Гарміш-Партэнкірхене і ў Вене, але не мела рэальных у родным горадзе.

**Сярод** безлічы кантэнту, які Ганна-Марыя праглядала ў вольны час у Сетцы, найбольш ёй падабаліся відэасюжэты, знятыя аматарамі на мабільныя тэлефоны. Закарцела і самой зрабіць унёсак у сусветнае непрафесійнае мастацтва. Тым болей, бацькі на дзень нараджэння падарылі смартфон, а сюжэтаў наўкол хапала з лішкам. Дык у якасці дэбюту яна выбрала гаротны лёс Максіма, якога амаль штодня калацілі, бы недаспелую грушу, на вачах усяго класа.

І калі хлопца чарговы раз дубасілі кулакамі аднакласнікі, Ганна-Марыя, прытаіўшыся за партай і прыкрыўшы смартфон падручнікам, зняла на мініяцюрную камеру сяміхвілінную сцэну пабоішча.

Дома праглядзела адзняты ролік і адчула, як рукі нервова задрыжэлі, а сэрца сціснулася ад невыноснага жалю. Здзек з падлетка, якога выспяткамі загналі пад парту, а той жаласліва верашчаў і прыкрываў галаву рукамі, глядзеўся на экране ноўтбука куды больш брыдка, чым у будзённасці. Камера смартфона адмежавала буйную прастору класа, дзе гэткае здарэнне выглядала дробным эпізодам, ды павялічыла на ўвесь манітор трагічнае ў сваёй звычайнасці відовішча.

Пэўна, такую ж рэакцыю адчулі і сотні карыстальнікаў сацыяльнай сеткі, куды Ганна-Марыя «заліла» свой відэадэбют пад назвай «Адзін дзень аднаго мінскага школьніка». Хтосьці з уражаных аматараў «перазаліў» яе твор на «Ю-Туб», дзе адлік штодзённых праглядаў пайшоў на тысячы. Ролікаў, у якіх збіваюць дзяцей, у лічбавай прасторы багата, але толькі «Анты-Барбі» стварыла сапраўдны дакументальны твор...

Наступствы аказаліся непрадказальнымі для ўсіх.

**Пра** тое, што ён неспадзявана зрабіўся медыйнаю асобай, Максім даведаўся ад інспектара па справах непаўналетніх, які раптоўна заявіўся да яго дадому. Інспектар не толькі распытаў Максіма пра школьныя ліхтугі ды склаў падрабязны пратакол, але і «пасвідраваў мозг» бацькам: маўляў, не клапоцяцца наконт здароўя сына, парушаюць ягоныя правы, за што заслугоўваюць адміністрацыйнай адказнасці. Потым павыклікаў на допыт хлопцаў, якія збівалі Максіма. Іхніх бацькоў таксама.

Трагічная сітуацыя ўмомант набыла адценне камічнай. Аднакласнікі, якія яшчэ ўчора навыперадкі валілі Максіма з ног, цяпер спалохана туліліся ля сцяны, калі хлопец праходзіў міма. Сам дырэктар школы выклікаў да сябе ў кабінет Максіма з бацькамі ды запэўніваў, што такое парушэнне дысцыпліны больш не паўторыцца ў падначаленай яму ўстанове. Нарэшце хлопец зажыў спакойна. Выкладчыкі з дырэктарскай падказкі ахвотна «накідвалі» яму бал-другі па ўсіх прадметах.

**Ганну-Марыю**, наадварот, беспадстаўна «засыпалі». На ўсю школу яна праславілася як каварная злаўмысніца. Аднакласніцы ледзьве атрутай не пляваліся ў яе, пыталіся: навошта ўлезла ў чужую справу? Хто яе прасіў?.. Дарэчы, Максім ёй нават «дзякуй» не сказаў — пасля размовы з дырэктарам хлопец адчуў сябе ўсемагутным і цяпер меркаваў, што ўсе праблемы сам уладзіў бы з цягам часу.

Бацькі «Анты-Барбі» ўсур'ёз задумаліся пра перавод дачкі ў іншую школу. Ды прыспела пара і мне ўмяшацца ў інцыдэнт. Прачытаўшы расповед Яўгена пра дэбютантку на ніве аматарскага кіно, я захацеў (ажно далоні засвярбелі) напісаць пра яе ў газету. Як сумленны журналіст узброіўся нататнікам, ручкай, дыктафонам і наведаўся з роспытамі да ўсіх удзельнікаў канфлікту. Пачаў, зразумела, з дырэктара школы. Уніклівая ўвага прадстаўніка медыя зменшыла эмацыянальнае напружанне. З новай дырэктарскай падказкі цкаванне «Анты-Барбі» згарнулася — цяпер яе ва ўпор не заўважалі. Дзяўчынку такая абыякавасць абнадзеіла — значыць, давучыцца да выпуску без прыгод.

**Пасля** таго, як мой матэрыял апублікавалі, я наведаў Ганну-Марыю, прэзентаваў ёй экзэмпляр газеты (не выпісвала яна аніякіх выданняў, навіны чытала на розных парталах) і пацікавіўся: як наогул справы?

З блага прыхаваным самалюбствам дзяўчына паправіла акуляры на носе, уключыла ноўтбук і прадэманстравала новыя відэаролікі. Сюжэты былі не дужа мудрагелістымі. Уранку дваравы каток бегаў па двары за гнаным ветрам цэлафанавым пакетам. Удзень п'яныя мужыкі, гайдаючыся, брылі міма ганка школы. Увечары вадзіцель белай «Рэно» манеўраваў па двары, шчыльна застаўленым аўтамабілямі, а потым прыпарквайся на прылеглай дзіцячай пляцоўцы.

— Ну, як уражанне? — стрымана спытала «Анты-Барбі».

— Няблага, але камера дрыжыць, — не змаўчаў я аб пакутах свайго вестыбюлярнага апарату падчас прагляду. — Варта набыць штатыў...

— Дарэчы, я хачу быць журналістам, — прызналася Ганна-Марыя.

— Чаму не кінарэжысёрам? — здзівіўся я.

— Кіношнікі збольшага прыдумваюць жыццё, — патлумачыла яна, — а мне падабаецца назіраць за будзёнай плынню, фіксаваць яе, звяртаць увагу на нявыкруткі, недарэчнасці, няславу. А потым бачыць, як нешта мяняецца. Не адразу, але, здараецца, што й да лепшага. Журналістам рэдка дзякуюць. Але хіба не ў тым і заключаецца высакароднасць, каб сумленна рабіць сваю справу і не чакаць падзякі?

— У іншых прафесіях таксама не дачакаешся падзякі. Я маю на ўвазе ўрачоў, міліцыянераў, выкладчыкаў...

На гэта Ганна-Марыя не прыдумала, што запярэчыць. Аднак ліміт яе пераканаўчасці не вычарпаўся. Яна пастукала пальцамі па камп'ютарнай «клаве» — і на экране з'явіўся яе самы свежы ролік: міліцэйскі эвакуатар выцягваў белае «Рэно» з дзіцячай пляцоўкі, а побач круціўся аўтаўладальнік і голасна ганіў «беззаконнасць».

— Такая вось мая сцяжына ў жыццёвым моры, — сказала яна пасля маўклівага прагляду. — Не самы горшы выбар. Праўда?

Спалучэнне сцяжыны з вадой падалося мне парадаксальным, але я зразумеў сутнасць яе думкі: сэнс жыцця ў тым, каб удасканальваць сябе, а па магчымасці — і навакольны свет.

Вядома, я падтрымаў дзяўчыну і сказаў:

— Ты не патонеш. Я пераканаў.

ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
22 верасня 2014
Прозвішча Ліхачэўскі В.В.
Подпіс

белагропромбанк
традиции будущего

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц сто восемьдесят девятого, сто девяностого выпусков

**1. Наименование эмитента:**

а) полное наименование:

на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);

б) сокращенное наименование:

на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

Телефон: (017) 229 63 25, факс (017) 229 64 43

Электронный адрес E-mail: info@belapb.by

УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая финансовая отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка либо о возбуждении в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций, и сроки их публикации**

Годовая финансовая отчетность Банка ежегодно публикуется в газетах «Звязда» и «Рэспубліка» не позднее 25 апреля года следующего за отчетным.

Годовая финансовая отчетность Банка за 2013 год опубликована 25.03.2014 в газетах «Звязда» (№ 54), «Рэспубліка» (№ 54).

В газете «Звязда» публикуется следующая информация:

- в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2-х месяцев с момента принятия такого решения;

- в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

- в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

**4. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 6 803 635 046 000 (Шесть триллионов восемьсот три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

**5. Депозитарием, обслуживающим Банк**, является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь, сроком действия до 18.07.2022, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085.

**6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол № 1) (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.06.2014 № 396).

Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто восемьдесят девятого, сто девяностого выпусков**

**7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решения о выпуске сто восемьдесят девятого, сто девяностого выпусков облигаций Банка для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка приняты Наблюдательным советом Банка 29.08.2014, протокол № 26.

**7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Выпуски облигаций осуществляются без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

По состоянию на 01.08.2014 нормативный капитал Банка составляет 9 826 643,7 млн. бел. рублей.

**7.3. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц.

Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены на фондирование выданных кредитов корпоративным клиентам вне рамок государственных программ.

**7.4. Выпуски облигаций согласованы Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 16.09.2014 № 568).

**7.5. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций**

| Номер выпуска | 189 | 190 |
|---|---|---|
| Валюта выпуска | Белорусский рубль | |
| Форма выпуска и вид облигаций | Бездокументарные, именные, процентные, неконвертируемые | |
| Объем эмиссии, млн. бел. рублей | 500 000,0 | 500 000,0 |
| Количество облигаций (шт.) | 500 000 | 500 000 |
| Серия, номера облигаций | ОБ189 0000001 - 0500000 | ОБ190 0000001 - 0500000 |
| Номинальная стоимость облигации, млн. бел. рублей | 1,0 | 1,0 |

**7.6. Сведения об открытой продаже облигаций сто восемьдесят девятого выпуска**

**7.6.1. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала периода размещения облигаций – 26.09.2014, дата окончания периода размещения облигаций – 25.08.2015.

В период размещения облигаций Банк вправе принять решение об изменении даты окончания открытой продажи облигаций.

**7.6.2. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций сто восемьдесят девятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто восемьдесят девятого выпуска.

Размещение облигаций в течение периода размещения осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах 1 и 2 уровней, центральном аппарате Банка в течение их рабочего времени.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в валюте номинала в безналичном порядке на счет Банка, указанный в договоре.

Банк вправе не заключать договоры купли-продажи облигаций в период размещения, если условия, определенные решением о выпуске облигаций, становятся для Банка экономически невыгодными. Решение о прекращении (возобновлении) заключения договоров купли-продажи облигаций в период размещения принимает уполномоченный орган Банка.

Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операций и рассчитывается по формуле:

$$С = Нп + Дн,$$

где:

С – текущая стоимость облигации;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Дн – накопленный процентный доход.

В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.

Накопленный процентный доход рассчитывается по формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд1 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + Нп \times Пд2 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + \ldots + Нп \times Пдn \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right)}{100},$$

где:

Дн – накопленный процентный доход;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Пд1, Пд2, ... Пдn – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 1 (Один) процентный пункт, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной (с первого по третий период начисления процентного дохода);

- ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной (с четвертого по двенадцатый период начисления процентного дохода);

Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

День начала размещения облигаций (дата выплаты последнего процентного дохода) и день расчета текущей стоимости облигаций считаются одним днем. При этом за даты выплаты процентного дохода принимаются даты, установленные в пункте 7.6.3 настоящей Краткой информации.

**7.6.3. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода**

Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в месяц за истекший период начисления дохода владельцам облигаций, которые указаны в реестре владельцев облигаций, а также владельцам облигаций, которые приобрели облигации в период размещения согласно соответствующим договорам после указанного срока формирования реестра до даты выплаты процентного дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода указаны в нижеследующей таблице:

| ПЕРИОДЫ НАЧИСЛЕНИЯ ПРОЦЕНТНОГО ДОХОДА | | | | Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода |
|---|---|---|---|---|
| Порядковый номер периода начисления дохода | Начало периода | Конец периода, дата выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | 27.09.2014 | 26.10.2014 | 30 | 22.10.2014 |
| 2 | 27.10.2014 | 26.11.2014 | 31 | 21.11.2014 |
| 3 | 27.11.2014 | 26.12.2014 | 30 | 22.12.2014 |
| 4 | 27.12.2014 | 26.01.2015 | 31 | 21.01.2015 |
| 5 | 27.01.2015 | 26.02.2015 | 31 | 23.02.2015 |
| 6 | 27.02.2015 | 26.03.2015 | 28 | 23.03.2015 |
| 7 | 27.03.2015 | 26.04.2015 | 31 | 22.04.2015 |
| 8 | 27.04.2015 | 26.05.2015 | 30 | 21.05.2015 |
| 9 | 27.05.2015 | 26.06.2015 | 31 | 23.06.2015 |
| 10 | 27.06.2015 | 26.07.2015 | 30 | 22.07.2015 |
| 11 | 27.07.2015 | 26.08.2015 | 31 | 21.08.2015 |
| 12 | 27.08.2015 | 26.09.2015 | 31 | 23.09.2015 |
| ИТОГО: | x | x | 365 | x |

Процентный доход выплачивается путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода в валюте номинала на счет владельца облигаций в дату окончания периода начисления процентного дохода.

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей Краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники, праздничные дни и другие, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Процентный доход по облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. Процентный доход по облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения) включительно.

Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.

Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей Краткой информацией, по процентной ставке равной:

- ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), увеличенной на 1 (Один) процентный пункт (с первого по третий период начисления процентного дохода);

- ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) (с четвертого по двенадцатый период начисления процентного дохода).

Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дп = \frac{Нп \times Пд1 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + Нп \times Пд2 \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right) + \ldots + Нп \times Пдn \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right)}{100},$$

где:

Дп – процентный доход, выплачиваемый периодически в течение срока ее обращения;

Нп – номинальная стоимость облигации;

Пд1, Пд2, ... Пдn – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, увеличенная на 1 (Один) процентный пункт, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной (с первого по третий период начисления процентного дохода);

- ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной (с четвертого по двенадцатый период начисления процентного дохода);

Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость.

Обязанность Банка по выплате процентного дохода по облигациям считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам счетов владельцев облигаций.

**7.6.4. Срок и порядок обращения облигаций**

Обращение облигаций сто восемьдесят девятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Срок обращения облигаций – 365 календарных дней с 26.09.2014 по 26.09.2015. День начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).

Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются:

- за три рабочих дня до даты выплаты процентного дохода (погашения);

- за пять рабочих дней до даты досрочного погашения облигаций.

**7.6.5. Дата погашения облигаций** – 26.09.2015.

**7.6.6. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Банк может принять решение о досрочном погашении облигаций сто восемьдесят девятого выпуска либо его части до даты окончания срока обращения в случае принятия соответствующего решения Наблюдательным советом Банка:

- приобретенных в полном объеме эмиссии либо не в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения;

- неразмещенных в полном объеме эмиссии либо оставшейся части неразмещенных облигаций;

- размещенных в полном объеме эмиссии либо части размещенных облигаций. О данном решении Банк письменно уведомляет владельцев облигаций и Биржу за пять рабочих дней до установленной даты досрочного погашения облигаций.

При досрочном погашении облигаций владельцу выплачивается номинальная стоимость, а также накопленный процентный доход за период с даты, следующей за датой продажи (датой выплаты последнего процентного дохода) по дату досрочного погашения облигаций включительно.

Досрочное погашение облигаций осуществляется Банком:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, который формируется депозитарием Банка за пять рабочих дней до установленной Банком даты досрочного погашения облигаций;

путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь причитающихся денежных средств в валюте номинала на счета владельцев облигаций.

В случае досрочного погашения части размещенных облигаций досрочное погашение осуществляется пропорционально количеству принадлежащих владельцам облигаций, при этом, количество досрочно погашаемых облигаций должно быть кратно целому числу. Расчет количества досрочно погашаемых облигаций осуществляется с округлением до целого числа с учетом двух знаков после запятой в следующем порядке:

если первая из отбрасываемых цифр (вторая цифра после запятой) больше или равна 5, то первая цифра после запятой увеличивается на единицу;

если первая из отбрасываемых цифр меньше 5, то увеличение не производится (отбрасывается вторая цифра после запятой). Таким же образом осуществляется округление до целого числа с учетом первой цифры после запятой.

Обязанность Банка по досрочному погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам счетов владельцев облигаций.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы облигаций обязаны не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения облигаций, осуществить перевод досрочно погашаемых облигаций на счет «депо» Банка № 100004, раздел 18, счет «депо» ЛОРО №1000009, раздел 00. Для осуществления перевода облигаций на счет «депо» Банка в депозитарий владелец облигаций обязан предоставить поручение «депо», в котором в реквизите «Назначение и (или) основание» указывается: «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением».

После досрочного погашения облигаций Банк в установленном порядке уведомляет Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о необходимости исключения из Государственного реестра ценных бумаг облигаций данного выпуска или его части.

**7.6.7. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения**

В период обращения облигаций Банк имеет право осуществлять приобретение облигаций до даты начала их погашения по собственной инициативе и (или) владельца облигаций:

- в даты выплаты процентного дохода, указанные в пункте 7.6.3 настоящей Краткой информации (за исключением 26.09.2015), по номинальной стоимости;

- в иные сроки на условиях, утвержденных уполномоченным органом Банка.

